ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

АЎТОРАК, 10 МАЯ 1938 г. № 26 (368) Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ТВОРЧЫ ПЛЕНУМ

Сёння адкрываецца пленум Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

У адрозненне ад мінулых пленумаў і агульных сходаў пісьменнікаў Совецкай Беларусі на гэтым пленуме, як відаць з апублікаванага парадку яго пасяджэнняў, менш будзе агульных размоў і больш дзелавога, канкрэтнага абмеркавання творчасці паасобных таварышоў.

Зазначым тут-жа, што канкрэтнасць абмеркавання будзе тым больш плённай, калі выступаючыя ў якасці асноўных дакладчыкаў пісьменнікі і крытыкі не звядуць даручанага ім разгляду таго ці іншага твора да абстрактнага аналізу адных яго спецыфічна літаратурна-мастацкіх кампанентаў, а зробяць гэты свой разгляд у святле агульных дасягненняў нашай краіны, яе палітыкі і задач, якія стаяць перад ёй на бліжэйшы час.

Толькі такое канкрэтнае абмеркаванне твораў Я. Купалы, У. Фінкеля, Я. Коласа, М. Клімковіча, К. Крапівы, П. Броўкі, У. Кандрацені і П. Панчанкі маем мы на ўвазе, калі гаворым аб дзелавым змесце работы пленума.

Скліканне пленума ў дні, калі рэспубліка рыхтуецца да першых выбараў свайго вярхоўнага органа ўлады на аснове Сталінскай Канстытуцыі перамогшага соцыялізма, таксама накладзе пэўны адбітак на работу пленума.

Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР, паасобныя пісьменнікі і паэты, партыйная арганізацыя саюза прарабілі прыкметную і надзвычай карысную грамадска-літаратурную работу ў дні падрыхтоўкі да выбараў Вярхоўнага Совета СССР. Зараз, у дні падрыхтоўкі да выбараў Вярхоўнага Совета БССР, трэба, скарыстаўшы набыты ўжо вопыт, зрабіць усё для таго, каб мастацкае слова загучала яшчэ больш выразна і магутна, чотка і акрэслена агітуючы за дэпутатаў народа — кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Мастацкае слова павінна стаць магутным рупарам прапаганды сталінскага блока на выбарах.

Трэба, каб 26 чэрвеня 1938 года было днём такім-жа радасным для беларускага народа і беларускай совецкай літаратуры, якім быў дзень 12 снежня 1937 года, калі ў Вярхоўны Совет СССР ад БССР былі аднагалосна абраны дэпутаты блока комуністаў і беспартыйных.

Прамінуўшы год быў для беларускай літаратуры, як і для ўсяго фронта культуры БССР, надзвычай памятным. Яшчэ год назад рады літаратараў БССР былі густа засмечаны заклятымі ворагамі совецкага народа — шпіёнамі і дыверсантамі польскай і нямецкай разведак. Па ўказцы заправіл трацкісцка-бухарынскага контррэволюцыйнага падполля ў СССР, пад апекай вырадкаў народа — прадажных сабак Шаранговіча, Чарвякова, Галадзеда гэта чорнае фашысцкае груганнё разбурала фронт соцыялістычнай культуры—літаратуру і мастацтва БССР. Як заразныя бацылы, ліхарадзілі пісьменніцкае асяроддзе розныя «літаратары» ад гестапо і дэфензівы. Яны кампраметыравалі беларускую совецкую літаратуру, узносячы на п'едэстал славы бездараў; яны усімі даступнымі ім спосабамі тармазілі рост і вылучэнне новых кадраў літаратараў, збіваючы выяўленую здольную моладзь на шлях багемы, на шлях эпігонства і творчага выраджэння.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, дзякуючы пільнасці совецкай разведкі — органаў НКВД на чале з сталінскім наркомам тав. Н. І. Ежовым рады беларускіх совецкіх пісьменнікаў ачысціліся ад фашысцкай пошасці і будуць да канца ачышчаны ад яе ахвосця. Гэта велізарная перамога літаратуры БССР за прамінуўшы год. У сваёй справаздачы пленуму в. а. старшыні праўлення ССП БССР тав. Лынькоў падрабязна раскажа, якія рэзультаты дала гэта перамога.

Першым і асноўным сярод іх з'явілася мацнейшае ідэйнае згуртаванне пісьменнікаў вакол комуністычнай партыі, павышэнне іх грамадска-палітычнай актыўнасці, знішчэнне творчай раз'яднанасці. Пісьменнікі пачалі больш цікавіцца творчасцю адзін другога, з'явіліся агульныя інтарэсы, агульная мова пры абгаварэнні творчых пытанняў. Групаўшчына, гэта дробнабуржуазная праказа на целе творчай арганізацыі, пачала знікаць і, трэба спадзявацца, будзе знішчана дашчэнту.

Другім, непасрэдна выцякаючым з першага, рэзультатам з'явілася напісанне радам пісьменнікаў новых мастацкіх твораў і распрацоўка імі новых тэм, палітычная актуальнасць якіх гаворыць сама за сябе. Кніга вершаў «Беларусі ордэнаноснай» Я. Купалы, раман аб барацьбе за Совецкую Грузію «Будучыня» Э. Самуйлёнка, гістарычная драма «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча, паэма аб герaічнай Іспаніі «Крывёю сэрца» А. Жаўрука, паэма аб совецкай жанчыне «Кацярына» П. Броўкі, хранікальная паэма аб Леніне ў Кастрычніку «У тыя дні» П. Глебкі, біяграфічная аповесць «Мендэле Мойхер Сфорым» У. Фінкеля, п'есы «Вайна—вайне» і «У пушчах Палесся» Я. Коласа, п'еса «Партызаны» К. Крапівы, новыя апавяданні Ю. Віцьбіча, маладых пісьменнікаў У. Кандрацені і У. Краўчанкі, гістарычная п'еса «Салавей» З. Бядулі, п'еса «Расплата за маладосць» К. Чорнага, паэма «Фелікс Дзержынскі» Э. Агняцвет, напісанне П. Броўкам і Е. Рамановічам лібрэта першых беларускіх опер, нарэшце пераклады рускіх і сусветных класікаў на беларускую і яўрэйскую мовы — усё гэта гаворыць за тое, што нашы пісьменнікі і паэты творча растуць, авалодваюць усё больш і больш складанымі па матэрыялу тэмамі і задачамі.

Трэцім рэзультатам з'явіўся паварот праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР у бок вырошчвання маладых і пачынаючых аўтараў. Праўда, паварот гэты зроблен больш у поглядах на маладых, чым на справе, але і гэта ўжо вядомае дасягненне. Разгляд пленумам творчасці двух маладых пісьменнікаў — празаіка У. Кандрацені і паэта П. Панчанкі кладзе ў гэтым сэнсе добры пачатак.

Сёння пленум пачынае сваю творчую работу. Перад яго адкрыццём мы хацелі-б сфармуліраваць яшчэ дзве задачы, на нашу думку вельмі важныя.

У краіне соцыялізма нараджаюцца і падрастаюць усё новыя і новыя пакаленні будаўнікоў комуністычнага грамадства. Мільёны і мільёны маладых грамадзян Совецкага Саюза нарадзіліся ў дні, калі на зямлі іх бацькоў руйнаваліся і знікалі апошнія цвярдыні капіталістычнага ладу. Яны не ведаюць не толькі гарадавога, як у нас прынята гаварыць. Яны не ведаюць ужо ні жахаў голаду і разрухі, ні жахаў грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі, ні жахаў тэхнічнай і культурнай адсталасці краіны ў такім яшчэ зусім нядаўным мінулым, якое для старэйшых пакаленняў нашых людзей здаецца толькі-што перажытым, бадай учарашнім днём. Мільёны цяперашніх вучняў совецкіх школ і дзесяткі мільёнаў тых, якія ідуць ім на змену, — гэта шчаслівыя людзі нашага радаснага сёння, светламу сазнанню якіх нягулясцівы ўспаміны аб перажытым чорным мінулым і параўнанне яго з сённяшнім днём. Вывучэнне мінулага дзецьмі гэтак-жа неабходна для выхавання з іх стойкіх патрыётаў радзімы, будаўнікоў комунізма, большэвікоў-інтэрнацыяналістаў, як і вывучэнне тэорыі класавай барацьбы, рэволюцыйнай тэорыі Маркса — Энгельса — Леніна—Сталіна.

Без гэтага вывучэння нашага ўчарашняга дня, як пачатку дня сённяшняга, маладыя пакаленні совецкіх грамадзян не змогуць належна ўсвеламіць і ацаніць тыя багатыя здабыткі і заваёвы, што запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі і чым моладзь наша карыстаецца як належным і само сабой зразумелым.

Без гэтага моладзь наша можа вырасці бяспечнай.

Мастацкія творы на тэмы паслякастрычніцкага перыяду і, асабліва, перыяду першай і другой сталінскіх пяцігодак павінны быць напісаны майстэрскай рукой. Гэта велізарная задача не толькі для нашых пісьменнікаў, якія пішуць для дзяцей, а ўжо для гэтых пісьменнікаў тым больш. Пленум не паставіў на абгаварэнне ні адной кніжкі, напісанай для дзяцей, але дакладчык праўлення, спадзяемся, не абміне творчасці дзіцячых пісьменнікаў і ў спрэчках па яго дакладу гэта задача будзе акрэслена ў патрэбным напрамку.

Перадавая літаратура свету, совецкая літаратура і адзін з яе баявых атрадаў — літаратура Совецкай Беларусі павінна сваімі сродкамі, сваім мастацкім словам спрыяць разбурэнню свету фашысцкага варварства і садзейнічаць аб'яднанню сіл для яго разбурэння. Патрэбны творы, якія-б увекавечвалі наш эканамічны і палітычны лад, нашы законы, Асноўны Закон нашага бяскласавага соцыялістычнага грамадства, якое з'яўляецца аплотам міжнароднага комуністычнага руху.

Гэта павінны быць творы вялікай нападаючай сілы, высокага пафасу, гераічнага гучання, бязмежнай шчырасці і шырыні пачуццяў, — творы, вартыя быць помнікамі нашай гераічнай Сталінскай эпохі і магутнай духоўнай зброяй у барацьбе за комунізм.

Пленум павінен загаварыць аб гэтым на поўны голас і па-дзелавому канкрэтна.

Пажадаем пісьменнікам поспеху ў вырашэнні ўсіх гэтых задач.

ПЛЕНУМ ССП БССР

Сёння ў 7 гадзін вечара ў Доме пісьменніка склікаецца пленум ССП БССР. Пленум разгледзіць наступныя пытанні:

1. Аб задачах пісьменнікаў у падрыхтоўцы да правядзення выбараў у Вярхоўны Совет БССР, дакладчык — в. а. старшыні ЦВК БССР тав. **Наталевіч.**

2. Справаздачны даклад Праўлення ССП БССР, дакладчык тав. **Лынькоў.**

3. Аб зборніку вершаў народнага паэта Я. Купалы «Беларусі ордэнаноснай», дакладчык тав. **Кучар.**

4. Аб творы У. Фінкеля «Мендэле Мойхер Сфорым», дакладчык тав. **Аксельрод.**

5. Аб п'есах: «У пушчах Палесся» Я. Коласа, дакладчык тав. **Клімковіч;** «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча, дакладчык тав. **Гурскі; «Партызаны»** К. Крапівы, дакладчык тав. **Вольскі;** лібрэта оперы «Міхась Падгорны» П. Броўкі, дакладчык тав. **Крапіва.**


6. Аб творчасці У. Кандрацені, дакладчык тав. **Чорны.**

7. Аб творчасці П. Панчанкі, дакладчык тав. **Броўка.**

ПРАЎЛЕННЕ ССП БССР.

КАРЛ МАРКС

(ДА 120-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)



Найвялікшы рэволюцыянер, правадыр і тэарэтык пролетарыята Карл Маркс быў геніяльнейшым мысліцелем і вучоным. Разам з Энгельсам ён стварыў навуковы комунізм — бессмяротнае вучэнне рабочага класа, магутную тэарэтычную зброю ў яго барацьбе.

Маркс першы адкрыў законы ўзнікнення, існавання і гібелі капіталізма, ён навукова давёў неабходнасць і немінучасць пераходу ад капіталізма да комунізма. Маркс першы абвясціў вялікую сусветна-гістарычную задачу пролетарыята як правадыра ўсіх прыгнечаных і эксплаатуемых — задачу нізвяржэння капіталізма і пабудовы комуністычнага грамадства.

Маркс разам з Энгельсам быў першым арганізатарам і правадыром перадавога атрада пролетарыята — комуністычнай партыі.

Карл Маркс нарадзіўся 5 мая 1818 года ў горадзе Трыры (прырэйнская Прусія). Тут ён скончыў гімназію, паступіў ва ўніверсітэт, спачатку ў Бонне, потым у Берліне, вывучаў юрыдычныя навукі, але больш за ўсё гісторыю і філасофію. Маркс рана пазнаёміўся з творамі Вольтэра, Руссо, энцыклапедыстаў, аказаўшых вялікі ўплыў на яго ідэйнае развіццё.

Студэнтам Маркс глыбока вывучыў усе творы Гегеля і яго школы і прымкнуў да гуртка левых гегельянцаў—тых вучняў Гегеля, якія, як пісаў Ленін, «імкнуліся рабіць з філасофіі Гегеля атэістычныя і рэволюцыйныя вывады». **(В. І. Ленін.** Творы. Том XVIII, стар. 5). Ужо ў гэтыя годы Маркс адзіўляў абшырнасцю сваёй філасофскай асветы, сваёй бліскучай дасціпнасцю, глыбінёй свайго мышлення.

У 1841 годзе Маркс скончыў універсітэт, абараніўшы дысертацыю на тэму аб філасофіі Эпікура.

Па сканчэнні ўніверсітэта Маркс пасяліўся ў Бонне, рыхтуючыся да выкладчыцкай дзейнасці. Але рэакцыйная палітыка ўрада прымусіла Маркса адмовіцца ад вучонай кар'еры. Маркс стаў журналістам. Ен пачаў працаваць у «Рэйнскай газеце» — прагрэсіўным органе, які пачаў выходзіць з 1 студзеня 1842 года ў Кельне і якім кіравалі левыя гегельянцы. Маркс змясціў у гэтай газеце рад бліскучых артыкулаў на палітычныя і эканамічныя пытанні. Газетная работа паказала Марксу, што ён недастаткова знаёмы з палітычнай эканоміяй, і ён старанна заняўся вывучэннем гісторыі і палітычнай эканоміі.

У 1843 годзе Маркс ажаніўся з Жэнні фон Вестфален, сяброўкай дзяцінства, і неўзабаве эмігрыраваў за граніцу. Жонка Маркса была вернай спадарожніцай яго жыцця, памочніцай у яго рабоце.

З 1843 па 1844 год Маркс жыў у Парыжы, а з 1845 да пачатку 1848 года ў Бруселі. Дружба Маркса з Энгельсам пачалася пасля іх сустрэчы ў Парыжы ў верасні 1844 года. Маркс і Энгельс прынялі тады самы гарачы ўдзел у кіпучым жыцці рэволюцыйных груп Парыжа. Паміж Марксам і Энгельсам устанавілася агульнасць поглядаў і імкненняў, рабіўшая іх сувязь непарыўнай на ўсё жыццё.

Маркс разам з Энгельсам пабудаваў тэорыю навуковага комунізма. Пад кіраўніцтвам Маркса і Энгельса ў 1847 годзе ўзнікнуў «Саюз комуністаў», які быў першай спробай арганізаваць комуністычную партыю. У гэтым годзе Маркс і Энгельс па даручэнню II кангрэса «Саюза комуністаў» стварылі найвялікшы дакумент у гісторыі чалавецтва — «Маніфест Комуністычнай партыі». «У гэтым творы, — пісаў Ленін,—з геніяльнай яснасцю і яркасцю абрысавана новае светасузіранне, паслядоўны матэрыялізм, які ахапляе і галіну соцыяльнага жыцця, дыялектыка, як найбольш усебаковае і глыбокае вучэнне аб развіцці, тэорыя класавай барацьбы і сусветна-гістарычнай рэволюцыйнай ролі пролетарыята, творца новага комуністычнага грамадства». (Там-жа. Стар. 6).

Калі выбухнула лютаўская рэволюцыя 1848 года, Маркс, высланы з Бельгіі, прыехаў на некаторы час у Парыж, а адтуль у Кёльн (Германія). Там з 1 чэрвеня 1848 года выходзіла «Новая Рэйнская газета», галоўным рэдактарам якой стаў Маркс. Гэта была першая газета рэволюцыйнага пролетарыята. Маркс паслядоўна асвятляў і ўскрываў на старонках газеты ролю розных класаў Германіі, падкрэсліваў гераічную барацьбу пролетарыята, выкрываў здрадніцкую палітыку баязлівай і подлай ліберальнай буржуазіі, паспяшыўшай заключыць саюз з рэакцыяй, а таксама непаслядоўную, хістаючуюся палітыку дробнабуржуазнай дэмакратыі.

«Новая Рэйнская газета» праіснавала да 19 мая 1849 года. За некалькі дзён да гэтага Маркс быў выслан з Германіі. Ен выехаў спачатку ў Парыж, а затым у Лондан, дзе і пражыў да самай смерці.

Пасяліўшыся ў Лондане ў якасці палітычнага эмігранта, Маркс пачаў велізарную работу па вывучэнню капіталістычнага ладу. Працаваць яму прыходзілася ў надзвычай цяжкіх матэрыяльных умовах. Нястача не раз пагражала задушыць Маркса і членаў яго сям'і ў абдымках голаду. Толькі пастаяннае самаадданае матэрыяльнае падтрыманне Энгельса дапамагло Марксу давесці да канца гіганцкую работу над «Капіталам».

Празмерная работа, якую прыходзілася весці Марксу, падрывала яго здароўе. Днём ён працаваў для заработку, а па начах над рукапісам «Капітала». Напружаная начная работа выклікала прыступы хваробы, якія выводзілі Маркса са строю, перашкаджалі яму працаваць.

У годы глухой рэакцыі, якая наступіла пасля паражэння рэволюцыі 1848 года, Маркс не пакідаў змагацца за новы ўздым рэволюцыйнай энергіі ў рабочым класе, не пакідаў выкрываць гнуснасці буржуазных дэмагогаў і крывадушнасць англійскіх ліберальных дзяржаўных дзеячоў.

Новы ўздым рабочага руху ў Еўропе пачаўся ў 60-х годах. У канцы 1864 года пад непасрэдным кіраўніцтвам Маркса ўзнікнула першая масавая пролетарская партыя «Міжнароднае таварыства рабочых» — Першы Інтэрнацыянал. Маркс быў душой гэтай арганізацыі, яе галоўным кіраўніком, аўтарам усіх яе важнейшых дакументаў — рэзалюцый, заяў, маніфестаў.

«Аб'ядноўваючы рабочы рух розных краін, стараючыся накіраваць у русла сумеснай дзейнасці розныя формы непролетарскага, дамарксісцкага соцыялізма (Мадзіні, Прудон, Бакунін, англійскі ліберальны трэд-юніянізм, ласальянскія хістанні ўправа ў Германіі і г. д.), змагаючыся з тэорыямі ўсіх гэтых сект і школ, Маркс выкоўваў адзіную тактыку пролетарскай барацьбы рабочага класа ў розных краінах» (В. І Ленін, там-жа, стар. 7), — так характарызуе Ленін работу Маркса ў гэты перыяд.

У красавіку 1867 года Маркс здаў у друк рукапіс першага тома «Капітала» — гэтай найвялікшай працы, у якой дадзен глыбокі навуковы паказ і тлумачэнне законаў узнікнення, развіцця і гібелі капіталістычнай грамадскай фармацыі. Гіганцкую затрату сіл і энергіі, жалезную вытрымку, надзвычайную працаздольнасць праявіў Маркс у рабоце над гэтай славутай кнігай. Ен прынёс ёй у афяру сваё здароўе, дабрабыт жыцця, інтарэсы сям'і.

Першы том «Капітала» выйшаў у свет у верасні 1867 года.

Праз некалькі год пасля гэтага ў гісторыі барацьбы рабочага класа адбылася буйнейшая падзея—упершыню ў гісторыі пролетарыят Парыжа ўзяў ўладу ў свае рукі. Парыжская Комуна, якая праіснавала ўсяго 72 дні — з 18 сакавіка па 28 мая 1871 года, была найвялікшым подвігам пролетарыята.

Маркс арганізаваў дапамогу і падтрыманне Парыжскай Комуне ўсімі, якія былі ў яго распараджэнні, сродкамі. Ен устанавіў з ёй рэгулярную сувязь, даваў членам урада Комуны каштоўныя ўказанні, а пасля яе падзення апублікаваў кнігу «Грамадзянская вайна ва Францыі (1871 год)», у якой, не ўтойваючы ні адной памылкі Комуны, даў вычарпальную характарыстыку і ацэнку найвялікшага сусветна-гістарычнага значэння рэволюцыйнай справы парыжскіх рабочых.

Асноўныя пачаткі арганізацыі пролетарскай дзяржавы, сфармуліраваныя Марксам на падставе вопыту Комуны, Ленін развіў, канкрэтызаваў, узбагаціў новым зместам, пачэрпнутым з вопыту рэволюцый XX стагоддзя. Ленін адкрыў дзяржаўную форму дыктатуры пролетарыята — совецкую ўладу, заваяную ў нашай краіне пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна.

Пасля таго, як Першы Інтэрнацыянал спыніў сваё існаванне, Маркс і Энгельс прадаўжалі быць цэнтрам, яднаючым рэволюцыйны рабочы рух розных краін. Да іх звярталіся за парадай кіраўнікі рабочых партый і Францыі, і Германіі, і раманскіх, і скандынаўскіх краін, і Амерыкі, і Расіі.

Уважліва сочачы за рабочым рухам ва ўсіх краінах, Маркс асаблівую ўвагу аддаваў Германіі, дзе з 1869 года арганізавалася соцыял-дэмакратычная партыя. На чале партыі стаялі тады Аўгуст Бебель і Вільгельм Лібкнехт, якія абралі сваім сцягам вучэнне Маркса. Аднак, у практычнай дзейнасці германскай соцыял-дэмакратыі было шмат памылак дробнабуржуазнага, згодніцкага характару.

Марксу і Энгельсу не раз прыходзілася крытыкаваць прымірэнцтва і згодніцтва правадыроў германскай соцыял-дэмакратыі. Асабліва выразна прыходзілася Марксу растлумачваць пытанне аб дыктатуры пролетарыята. Маркс вызначае дыктатуру пролетарыята як **«класавае панаванне** рабочых над супраціўляючыміся ім праслойкамі старога свету». Гэта класавае панаванне, — гаворыць Маркс, — будзе прадаўжацца да таго часу, пакуль не будуць разбураны эканамічныя асновы існавання класаў. Без рэволюцыйнай барацьбы, без рэволюцыйнага гвалту нельга ліквідаваць класы.

Высунуўшы вучэнне аб гегемоніі і дыктатуры пролетарыята, Маркс у той-жа час растлумачыў, што пролетарыят з'яўляецца правадыром сялянскіх мас. Маркс вучыў, што пролетарыят, захапіўшы ў свае рукі дзяржаўную ўладу, павінен будзе прыняць меры да паляпшэння становішча сялянства і тым самым прыцягнуць яго на бок рэволюцыі. У гэтых мерах павінен быць зародыш пераходу ад прыватнай уласнасці да ўласнасці калектыўнай, каб сяляне маглі лёгка перайсці ад дробнай прыватнай да буйнай грамадскай сельскай гаспадаркі.

Гэту палітыку, намечаную Марксам, канкрэтызаваў, развіў і ажыццявіў Ленін і геніяльны прадаўжальнік яго справы таварыш Сталін. Партыя Леніна — Сталіна, праводзячы ў жыццё гэту палітыку, забяспечыла бліскучую перамогу буйнага калектыўнага земляробства ў СССР.

Да канца сваіх дзён Маркс прадаўжаў кіраваць ходам рабочага руху ва ўсіх краінах, у той-жа час няспынна ведучы каласальную навуковую работу.

У канцы 1869 года, калі Марксу было ўжо 51 год, ён прыступіў да вывучэння рускай мовы і на працягу трох месяцаў авалодаў ёю настолькі, што мог самастойна чытаць кнігі па рускай эканоміцы. Маркс вывучаў аграрнае пытанне ў Расіі. Наогул Расія яго цікавіла, як краіна, дзе наспявала рэволюцыя. Маркс прадбачыў, што перамога рэволюцыі ў Расіі будзе мець велізарнейшае значэнне для сусветнай рэволюцыі.

2 снежня 1881 года памёрла жонка Маркса. У студзені 1883 года памёрла яго любімая старэйшая дачка, а праз два месяцы, 14 сакавіка таго-ж года, Маркс памёр, ціха заснуўшы навекі ў сваім крэсле. Ен пахаван разам са сваёй жонкай і адданай служанкай, амаль членам сям'і, Еленай Дэмут, на могілках Хайгейт у Лондане.

З часу смерці Маркса прайшло больш 55 год. Буржуазія і яе лакеі нямала сіл патрацілі на тое, каб сказіць вучэнне Маркса, сказіць яго вобраз, у ілжывым святле прадставіць яго жыццё і асобу. У наш час ролю «магільшчыкаў марксізма» узялі на сябе фашысты. З повадў гэтых смехатворных спроб «пахаваць марксізм» таварыш Сталін на XVII з'ездзе ВКП(б) сказаў

«Гавораць, што на Захадзе ў некаторых дзяржавах ужо знішчан марксізм. Гавораць, што яго знішчыла быццамбы буржуазна - нацыяналістычная плынь, называемая фашызмам. Гэта, вядома, глупства. Так могуць гаварыць толькі людзі, не ведаючыя гісторыі. Марксізм ёсць навуковае выражэнне карэнных інтарэсаў рабочага класа. Каб знішчыць марксізм, трэба знішчыць рабочы клас. А знішчыць рабочы клас немагчыма. Больш 80 год прайшло з таго часу, як марксізм выступіў на арэну. За гэты час дзесяткі і сотні буржуазных урадаў спрабавалі знішчыць марксізм. І што ж? Буржуазныя ўрады прыходзілі і адыходзілі, а марксізм заставаўся. **(Бурныя апладысменты).** Больш таго, — марксізм дабіўся таго, што ён атрымаў поўную перамогу на адной шостай частцы свету, пры чым дабіўся перамогі ў той самай краіне, дзе марксізм лічылі канчаткова знішчаным». **(Бурныя апладысменты).** (І. Сталін. Пытанні ленінізма. Стар. 597).

Пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна расійскі пролетарыят выканаў заветы Маркса і Энгельса: ён заваяваў уладу, устанавіў сваю дыктатуру, пабудаваў у асноўным соцыялізм — першую фазу комунізма, стварыў магутную соцыялістычную дзяржаву.

Вялікая комуністычная партыя, кіруемая ленінска-сталінскім Цэнтральным Камітэтам, вядзе Краіну Советаў ад перамогі да перамогі. Чаму абавязана партыя гэтымі сваімі поспехамі? «Таму, — сказаў таварыш Сталін, на XVII з'ездзе партыі, — што яна з'яўляецца партыяй марксісцкай, партыяй ленінскай. Яна абавязана таму, што кіруецца ў сваёй рабоце вучэннем Маркса, Энгельса, Леніна. Не можа быць сумнення, што пакуль мы застанемся вернымі гэтаму вучэнню, пакуль мы валодаем гэтым компасам — будзем мець поспехі ў сваёй рабоце». (Там-жа).

Ідэі Маркса і Энгельса, Леніна і Сталіна знайшлі сваё бліскучае ўвасабленне ў вялікай Краіне Советаў. Яны пераможуць на ўсім свеце.

В. АДАРАЦКІ.

В. Р. МЕНЖЫНСКІ

(Да 4-й гадавіны з дня смерці).

Чатыры годы назад найміты фашыстаў — бандыты, шпіёны і забойцы з трацкісцка-бухарынскай шайкі ажыццявілі ўмярцвенне непахіснага большэвіка-чэкіста, старшыні калегіі АДПУ тав. Вячэслава Рудольфавіча Менжынскага.

Займаючы свой адказны пост, В. Р. Менжынскі быў гразой наймітаў гестапо, права-трацкісцкіх бандытаў, рэстаўратараў капіталізма: яны як пабітыя псы, баяліся свайго выкрыцця. Іх мэтай было — пасадзіць на пасаду кіраўніка АДПУ бандыта з сваёй шайкі, іх брудныя лапы, акрываўленыя крывёю сыноў народа, адданых барацьбітоў за справу соцыялізма, за справу партыі Леніна—Сталіна, спынілі дыханне Вячаслава Рудольфавіча, спынілі загартаванае барацьбой з ворагамі соцыялістычнай радзімы сэрца.

Вячэслаў Рудольфавіч Менжынскі нарадзіўся ў 1874 годзе ў сям'і настаўніка. У 90 гадах мінулага стагоддзя ён прымаў актыўны ўдзел у рэволюцыйным руху студэнтаў. У РСДРП тав. Менжынскі ўступіў у 1902 годзе.

Буйны арганізатар і кіраўнік барацьбы за вызваленне працоўных Вячэслаў Рудольфавіч у 1907 годзе быў прымушан пакінуць Расію, ратуючыся ад царскіх псоў — жандароў і паліцэйскіх. Да 1917 года ён пабываў у Бельгіі, Швейцарыі, Францыі і вярнуўся на сваю радзіму пасля лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі.

Да Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі тав. Менжынскі працаваў у петраградскай ваеннай арганізацыі большэвіцкай партыі і рэдагаваў газету «Солдат».

Пасля Кастрычніцкай рэволюцыі тав. Менжынскі быў прызначан народным камісарам фінансаў, а ў 1918 годзе — генеральным консулам РСФСР у Берліне.

З 1923 года Вячэслаў Рудольфавіч працаваў у органах АДПУ, спачатку намеснікам старшыні калегіі АДПУ, а з 1926 года да сваёй смерці — старшынёй калегіі.

Вячэслаў Рудольфавіч быў членам ЦК ВКП(б) з XV з'езда. На які-б участак работы ні накіроўвала яго комуністычная партыя, ён усюды і заўсёды праводзіў бязлітасную барацьбу з ворагамі краіны, трацкісцка-бухарынскімі і «левы»-эсэраўскімі здраднікамі, бандытамі і забойцамі. Палкае сэрца большэвіка Менжынскага было поўна пякучай нянавісці да ворагаў народа.

Вялікі совецкі народ ніколі не забудзе большэвіка Менжынскага, аддаўшага ў барацьбе за шчасце народа сваё жыццё.

КАНДЫДАТЫ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

З вялізарным уздымам праходзяць у гарадах і вёсках БССР перадвыбарчыя сходы рабочых, служачых, інжынераў, калгаснікаў, работнікаў культуры і мастацтва, на якіх камячаюцца кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

БАБРУЙСК

З вялікім уздымам прайшоў перадвыбарчы сход на фанерным заводзе імя Кірава. Прысутнічала 600 чалавек. Прапанова начальніка сартыровачнага цэха тав. Лебедзева вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тварца Канстытуцыі таго, хто даў нам радасць і шчасце, хто вядзе нас ад перамогі да перамогі, — любімага, дарагога **Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна**, — была спаткана бурай авацый і радаснымі воклічамі.

Сход аднадушна вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР вялікага **Сталіна** і яго бліжэйшых саратнікаў **В. М. Молатава, Л. М. Кагановіча, К. Е. Варашылава, М. І. Калініна, А. А. Андрэева, Н. І. Ежова, А. І. Мікаяна, В. Я. Чубара, С. В. Касіора, А. А. Жданава, Н. С. Хрущова.**

МОЗЫР.

На перадвыбарчым сходзе рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў мэблевай фабрыкі «Профінтэрн», на якім прысутнічала 300 чалавек, аднагалосна вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышы **І. В. Сталін, В. М. Молатаў, М. І. Калінін, Н. І. Ежоў, Л. М. Кагановіч, К. Е. Варашылаў, В. Я. Чубар, А. А. Волкаў, Н. Я. Наталевіч, Б. Д. Берман.**

Перадвыбарчы сход рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых мозырскага лесазавода «Пролетарый», на якім прысутнічала 250 чалавек, вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышоў **Сталіна, Молатава, Варашылава, Ежова, Кагановіча, Волкава і Наталевіча.**

МАГІЛЕЎ.

На перадвыбарчым сходзе рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых шоўкавай фабрыкі імя Куйбышава, на якім прысутнічала 650 чалавек, аднадушна вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышы **І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, Л. М. Кагановіч, Н. І. Ежоў, А. А. Волкаў.**

ВІЦЕБСК.

На перадвыбарчым агульным сходзе рабочых, работніц, інжынераў і служачых панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ», на якім прысутнічала 1800 чалавек, аднадушна вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышы **Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Чубар, Мікаян, Ежоў, Касіор, Жданаў, Петроўскі, Волкаў.**

МЕНСК.

На перадвыбарчым сходзе рабочых, служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў швейнай фабрыкі «Кастрычнік», на якім прысутнічала 2.000 чалавек, аднадушна вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышы **Сталін, Молатаў, Калінін, Варашылаў, Левіцкі, Берман і Кавалёў.**

Перадвыбарчы сход на абутковай фабрыцы імя Л. М. Кагановіча вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышоў **Сталіна, Кагановіча, Калініна, Молатава, Варашылава, Ежова, Волкава, Наталевіча і Бермана.**

ОРША.

Перадвыбарчы сход рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых аршанскага ільнокамбіната, на якім прысутнічала 1.100 чалавек, вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышоў **Сталіна, Молатава, Кагановіча, Варашылава, Ежова, Калініна і Левіцкага.**

ПЕТРЫКАЎ.

Перадвыбарчы сход калгаснікаў, калгасніц, настаўнікаў і медработнікаў паселішча Ляскавічы, Капцэвіцкай выбарчай акругі, з вялікім уздымам аднадушна вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышоў **Сталіна, Молатава, Кагановіча, Варашылава, Ежова, Калініна, Волкава,** сакратара аргбюро ЦК КП(б)Б па Палескай вобласці таварыша **Маркіна** і выконваючага абавязкі сакратара ЦВК БССР тав. **Ермака.**

П'есы, прысвечаныя выбарам ў Вярхоўны Совет Беларускай ССР

Секцыя драматургаў Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР 8 мая абмеркавала творы, напісаныя да выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Тав. К. Чорны напісаў аднаактную п'есу аб пільнасці і абароне радзімы. У п'есе паказаны людзі прымежнага калгаса — адданыя патрыёты радзімы, надзейныя памочнікі пагранічнікаў. У гэтай п'есе драматург паказвае шчаслівае заможнае жыццё нашых калгаснікаў і іх баявую гатоўнасць да абароны свяшчэннай совецкай зямлі. П'еса вобразна раскрывае 133 артыкул Сталінскай Канстытуцыі аб тым, што абарона социялістычнай бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны абавязак грамадзян СССР.

У аднаактнай п'есе М. Клімковіча «Свяшчэнны абавязак» раскрываецца тэма пільнасці і аховы соцыялістычнай уласнасці. Драматург стварыў цікавыя вобразы совецкіх людзей — дэпутата Вярхоўнага Совета СССР, калгасніка-конюха, комсамольцаў і піонераў; паказаў барацьбу з ворагамі народа, большэвіцкую пільнасць совецкіх людзей.

І. Гурскі напісаў аднаактную п'есу «На варце» — аб нашым прымежжы. Драматург паказаў людзей прымежнага калгаса — патрыётаў радзімы, якія актыўна дапамагаюць пагранічнікам у ахове граніцы.

М. Ільінскі напісаў вадэвіль «Нашы старыя». Тэма вадэвіля — права на шчаслівую, забяспечаную старасць, запісанае і гарантаванае Сталінскай Канстытуцыяй.

Е. Рамановіч зрабіў літаратурны мантаж з песень — урыўкаў з пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну і лепшых твораў паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мантаж паказвае прыгнечаную ў мінулым Беларусь і радасныя дні Совецкай Беларусі, шчаслівае жыццё совецкага народа пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Усе гэтыя работы драматургаў адобраны секцыяй. Зараз—задача: у самы бліжэйшы тэрмін данесці гэтыя творы да шырокіх мас, да гледачоў. Патрэбна неадкладна выдаць зборнік, які будзе надзвычай каштоўным для нашых тэатраў і гурткоў мастацкай самадзейнасці.

А. Б.

Маладзёжная сімфонія

Малады кампазітар-комсамолец Падкавыраў П., які нядаўна скончыў Дзяржаўную кансерваторыю БССР па класу прафесара Залатарова, сваю першую работу — сімфонію — прысвяціў ленінскаму комсамолу, і хоць сімфонія не мае праграмы, тым не менш музыкальная фактура яе мае дастаткова элементаў, якія апраўдваюць гэта прысвячэнне. Тут і вясёлая, радасная піонерская дзятва, тут і поступ моцных і смелых юнакоў і дзяўчат—комсамольцаў, якія ўпэўнена і бадзёра ідуць наперад.

Увесь музыкальны матэрыял сімфоніі ў аснове мае два пачаткі: адзін — заклікаючы, другі — лірычны. Актыўнай, заклікаючай тэмай сімфонія пачынаецца і заканчваецца.

Першая частка сімфоніі дае малюнак святочнага маладзёжнага карнавала. Спачатку актыўная тэма сігнальнымі, бадзёрымі выкрыкамі медных інструментаў заклікае да масавага ўдзелу ў гэтым свяце. Далей разгортваецца маршападобны рух з яркай масавай песеннай мелодыяй. Потым выступае другая асноўная тэма сімфоніі (ў валторнаў) — светлая, пявучая, у духу шырокай напеўнай народнай мелодыі, якая прымае потым афарбоўку пастаральнага пейзажу.

Другая частка сімфоніі — павольная, пявучая, са светлай лірычнай тэмай. Гэта частка вельмі свежая, арыгінальная, гарманічна войстрая, рысуе задушэўныя моманты і моманты апісальнага пейзажнага характару, мае яркія драматычныя нарастанні, хвалюючыя і жыццёсцвярджальныя настроі.

Трэцяя частка — скерца са жвавай, жартаўлівай, іграючай смехам і задорам тэмай. У сярэдняй частцы (трыо) кампазітар дае эпізод чатырох сімфанічных інструментаў, відаць нейкі накід індывідуальных праяў. Гэта частка выконвалася з вялікімі скарачэннямі, таму стварыла малапераканаўчае ўражанне, за выключэннем яркага і цікавага пачатку.

Чацвертая частка — фінал сімфоніі—перадае радасны і ўрачысты настрой.

Да гэтага твора мы не можам падыйсці як да твора майстра. Вопытны слухач знойдзе ў сімфоніі элементы рознастайных уплываў, сярод якіх ёсць і моманты фармальных штукарстваў, і некаторае арыгінальнічанне, надуманасць. Гэта няспеласць адчуваецца і ў аперыраванні тэматычным і гарманічным матэрыялам. У сімфоніі шмат доўгіх, дакучлівых паўтарэнняў, музыкальная фактура не мае цвёрдай накіраванасці, адзінства, матэрыял раскідан, шмат непаслядоўнасці. У аркестроўцы недастаткова фарбаў, рад пустот, грузнасці, правалаў, недаробленых сцэн.

Усе гэтыя рысы асабліва выступаюць у першай і ў трэцяй частках (трыо) сімфоніі, дзе аўтар найбольш раскіданы і непаслядоўны.

Нягледзячы на вялікія і сур'ёзныя мінусы сімфоніі, абавязваючыя аўтара перагледзець сваю працу, і многае карэнным чынам пераапрацаваць, мы ўправе гаварыць аб сімфоніі Падкавырава, як аб значнай з'яве ў нашай беларускай сімфанічнай літаратуры.

Музыкальная мова сімфоніі вельмі цікавая, у ёй шмат вынаходлівасці, арыгінальнасці ў самым добрым сэнсе гэтага слова. Дастаткова праслухаць другую павольную частку сімфоніі, каб сказаць аб свежым і арыгінальным таленце маладога кампазітара. Гэта безумоўна лепшая і цікавая сама па сабе частка, за якой ідзе фінал, які таксама пакідае вельмі добрае ўражанне. Абедзве часткі яшчэ больш выйграюць, калі з іх выкінуць усё непатрэбнае.

Добра задуман і выканан пачатак трэцяй часткі — скерца, жывы і яркі рысунак здаровай, маладой весялосці. Гэтыя месцы (другая, чацвертая частка і пачатак трэцяй) — сапраўдная творчая ўдача кампазітара, якая цалкам апраўдвае думку аб яго сімфоніі, як аб значным, яркім і цікавым творы. Застаецца толькі пажадаць тав. Падкавыраву плённай работы, строгіх і крытычных адносін да сваіх аўтарскіх недахопаў і далейшага творчага росту.

Н. Ш.

ПІСЬМЕННІКІ Ў ПЕРАДВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

Пісьменнікі і паэты Менска прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Рад таварышоў вылучаны прапагандыстамі на выбарчыя ўчасткі. Арганізавана шэсць брыгад паэтаў для выступленняў з чыткай сваіх твораў на выбарчых участках.

Мастацкая літаратура ўзбагацілася радам твораў, прысвечаных выбарам. У бліжэйшы час з друку выходзіць кніга «Беларусь ордэнаносная», у складанні якой прынялі ўдзел тт. Лынькоў, Клімковіч, Шапавалаў.

Тт. Клімковіч, Чорны, Рамановіч, Ільінскі, Гурскі напісалі аднаактныя п'есы, прысвечаныя выбарам. Калектыў паэтаў піша цыкл песень аб Сталінскай Канстытуцыі. Маладыя паэты Калачынскі і Хадарэнка напісалі песню і марш, прысвечаныя выбарам. Ільінскі напісаў апавяданне «Артыкул 102».

Многія пісьменнікі і паэты працуюць над творамі, прысвечанымі выбарам.



«На аэрадроме»—карціна мастака Зальцмана.

Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

ПІМЕН ПАНЧАНКА

РАДЗІМЕ

Я малым хлапчуком палюбіў твае пушчы і нівы,
І блакітныя рэкі, і глыб серабрыстых вазёр.
Ты мяне гадавала, як маці, і рос я шчаслівым
Пад шырокім разлівам вячэрніх і ранішніх зор.

Я не веру, што ў небе мая пуцяводная зорка —
Мне асвечвае шлях свет Крэмлёўскіх рубінавых зор.
Маё шчасце і радасць стварылі ў саюзе сяброўскім
Адзінаццаць багатых і дужых рэспублік-сясцёр.

О, радзіма! Табою напоўнена сэрца да краю,
І заўжды — ці працую, ці пільна ў дазоры стаю —
Я твой велічны вобраз у думках сваіх уяўляю
І люблю, як жыццё, я — зямлю маладую тваю.

Бо на гэтай зямлі малаком мяне маці карміла,
Тут хадзіць я вучыўся і першыя кнігі чытаў.
Што-ж мне можа быць больш за радзіму любімую міла?
Хто-ж мне будзе радней за таго, хто радзіму стварыў?

Я спакойны юнак. Можа, нават крыху сарамлівы.
Не пакрыўджу і птушкі, бо знаю — ёй хочацца жыць.
Але тых, хто жадае напасці на край мой шчаслівы,
Я сваімі рукамі без жалю гатоў задушыць.

М. ДЗЯДЗЮЛЯ

ПЕСНЯ

Узыходзілі зоры ясныя,
І заходзілі ў небе заранькі.
У бядзе жыла я, няшчасная,
Нацярпелася злога гораньха.
Нацярпелася і пабачыла
Долі горкае сялянскае,
Маладыя дні прабатрачыла,
Пот и кроў ллючы ў поле панскае.
Нерасцвіўшая маладосць-краса
Прапай пяжкаю адбіралася.
І дзявочая русая каса
Сівізной густой убіралася.
А сягоння я разлучылася
З доляй горкаю, беспрасветнаю,
Назаўсёды мне прасвятлілася
Пуць дарожанька ў дні светлыя.
Адышлі ў нябыт дні суровыя,
Адышлі ў нябыт дні няшчасныя.
Загараліся зоры новыя,
Загараліся зоры ясныя.
Тыя зораньхі заваёваны,
У Кастрычніцкі дзень запалены,
У баях яны загартованы
Любым Леніным, мудрым Сталіным.
І гараць яны, не стухаючы,
Ллюць з Крэмлеўскіх веж промні светлыя.
І працую я прыпяваючы,
Ласкай сталінскай абагрэтая.

ПЕСНЯ ДЗЯЎЧЫНЫ

Усход убіраючы ў чырвань,
Агністае сонца ўстае.
У полі шырокім дзяўчына
Вясёлую песню пяе.
«Паехаў далёка любімы
Ў чырвонае войска служыць
Даверыла наша радзіма
Яму вартаваць рубяжы.
Радзіма мая узрасціла
Яго, маладога арла,
Дала і адвагу, і сілы,
У рукі вінтоўку дала.
Стаіць ён высокі і дужы,
Вінтоўку трымае рукой,
Вартуе адданы і мужна
Вялікай радзімы спакой.
Бясстрашна нясе абарону
Свяшчэнных совецкіх граніц,
Ахоўвае шчасце мільёнаў
Аулаў і сёл, і станіц.
І, грудзі ўзнімаючы горда,
Цвіце, каласіцца зямля.
І мірна працуюць народы
На вольных, багатых палях».

Выстаўка выяўленчага мастацтва, прысвечаная 20-годдзю вызвалення БССР ад белапалякаў

Пры Упраўленні па справах мастацтваў пры СНК БССР створан Мастацкі Совет па падрыхтоўцы выстаўкі выяўленчага мастацтва, прысвечанай 20-годдзю вызвалення БССР ад белапалякаў. У склад Совета ўвайшлі жывапісцы і скульптары **Волкаў, Керзін, Грубэ, Пашкевіч, Манасзон і Зайцаў.**

Выстаўка будзе складацца з аддзелаў: барацьба беларускага народа са сваімі прыгнятальнікамі ў дакастрычніцкі перыяд. Вялікі Кастрычнік на Беларусі, барацьба за вызваленне БССР ад белапалякаў, соцыялістычнае будаўніцтва, культура і быт беларускага народа, беларускі пейзаж і інш.

З асноўнай групай жывапісцаў і скульптараў, якая налічвае 25—30 чалавек, будуць заключаны дагаворы, астатнія мастакі прымуць удзел у падрыхтоўцы выстаўкі ў парадку конкурса.

Многія жывапісцы і скульптары прынялі ўжо канкрэтныя абавязацельствы па падрыхтоўцы да выстаўкі.

В. В. Волкаў піша карціну «Уступленне Чырвонай Арміі ў Менск», **Пашкевіч** абраў для сваёй работы тэму «К. Е. Варашылаў прымае парад войск БВА пасля манеўраў», **Зайцаў** — тэму «Орджанікідзе на разведцы пад Барысавам», **Манасзон** — «Нямецкая акупацыя», **Ахрэмчык** (Віцебск)—«Кагановіч на Палессі», **Забораў** — «Прывод партызанамі палонных белапалякаў у штаб Чырвонай Арміі», **Красоўскі** — «Беларускія ткачыхі-калгасніцы», **Гедда** (Магілеў)—«Варашылаўская конніца», **Кругер** — «Варашылаў—дэпутат Вярхоўнага Совета СССР», **Цэхановіч Е.**—«Спайманне дыверсанта пагранічнікамі», **Віер** — «Дрэваапрацоўчы завод», і г. д.

Скульптар **Грубэ** рыхтуе барэльеф на дрэве — «Будзённы сярод байцоў Першай коннай», **Бембель** — скульптуру «Барацьба за Менск», **Азгур** — скульптуру «Ленін—Сталін», **Керзін**—«Шчаслівае юнацтва», **Бразер** — «Варашылаў», **Рыттэр** — «Ахова граніцы»; **Глебаў** будзе рабіць групу «Выгнанне белапалякаў з БССР», **Бохан** — «Калгасніца-жывёлаводка», **Анцэлевіч** — «Тапкіст».

Рад жывапісцаў і скульптараў ужо заключылі дагаворы і прыступілі да творчай працы.

Ів. ШАПАВАЛАЎ

Чаму хвалюецца чалавек

Чалавек, задаволена ўсміхаючыся, ішоў да хутара. З выгляду яму можна было даць гадоў 25. Апранут ён быў у дабротнае бобрыкавае паліто. Новая чорная кепка крыху ссунута на патыліцу. Да галошаў, яшчэ не страціўшых глянцу, папрыліпаў бура-шэры бруд, але ішоўшы, не звяртаючы ўвагі ні на бруд, ні на слоту, крочыў так, быццам быў самым бесклапотным чалавекам на свеце. Нават неяк занадта бесклапотна выглядаў гэты чалавек.

Падышоўшы да хутара, чалавек павёў плячыма, аберуч паправіў кепку Твар яго стаў заклапочана-сур'ёзным. Упэўнена адчыніўшы дашчаныя вароты, ён, адмахваючыся ад наляцеўшага на яго кашлатага, з абвіслым ашмоццем, поўсці сабакі, аклікнуў ўжо не маладую жанчыну, якая выглянула з хлява.

— Прагані сабаку, гаспадыня.

Цопаючы па бёдрах рукамі, жанчына адагнала сабаку. Пёс з пакрыўджаным выглядам, нездаволена гыркаючы адышоў і лёг пад вакном хаты на прызьбе.

— Вам каго? — Жанчына пільна аглядала незнаёмага.

— Гаспадар дома?

— Няма. У праўленне яго паклікалі.

— Ну, дарма, зойдзем у хату. Я ўпаўнаважаны Эн-Ка-Вэ-Дэ.

На твары ў жанчыны выявілася здзіўленне.

— Заходзьце, — прапанавала яна, адчыняючы дзверы ў хату.

У чыста вымытай і прыбранай перад выходным днём хаце ў пярэднім куце за сталом сядзелі хлопчык і дзяўчынка. Хлопчык год дзесяці, водзячы пальцам па старонцы кніжкі чытаў напоўголаса. Дзяўчынка, старэйшая, глыбокадумна грызучы алоўак, задумалася над арыфметычнай задачай. На скрып дзвярэй яны абодва павярнуліся і з юнай цікаўнасцю ўтаропіліся на незнаёмага госця. Чалавек упэўнена падышоў да стала.

— Дайце дзядзю месца. Прыбярыце покуль свае кніжкі.

Дзеці ссунулі кніжкі ў бок. Чалавек сеў, пашнырыў па кішэнях паліто, выцягнуў пачку... пашпартаў, з глыбокадумным выглядам заглянуў у некаторыя з іх і паклаў пачку на стол, накрыўшы яе далонню.

— Так, дык я ўжо сказаў, што з'яўляюся ўпаўнаважаным Эн-Ка-Вэ-Дэ Глускага раёна. Мы зараз праводзім перарэгістрацыю пашпартаў. Пашпарт вашага мужа дома?

— Дома, вядома, — жанчына ўзабралася на лаўку і з-за бэлькі пад столлю дастала акуратна завернутыя ў газету пашпарты.

— Вось і добра, — незнаёмы, які ўважліва наглядаў за дзеяннямі жанчыны, неяк залішне таропка ўзяў дакументы з яе рук, — ...і воінскі білет тут? Зусім добра. Як прозвішча?.. Курс?..

— Курс, Аляксандр Цімафеевіч, — паперадзіла адказала жанчына.

— Ну, добра. Я забяру ў вас гэтыя дакументы. Заўтра вы іх атрымаеце пасля перарэгістрацыі ў праўленні калгаса. — Незнаёмы падняўся, запхнуў разам з астатняй пачкай дакументы Курса ў кішэню і накіраваўся да дзвярэй.

— ...Дык... вы распіску-б пакінулі,— жанчына з некалькі разгубленым выглядам пайшла за ім.

Незнаёмы спагадліва ўсміхнуўся.

— Ты што, грамадзянка? Эн-Ка-Вэ-Дэ не верыш? Не твой адзін пашпарт у мяне. Заўтра атрымаеш назад, — і выйшаў з хаты.

— Мамка, трэба было-б тату пачакаць, — дзяўчынка з запытаннем паглядзела на матку.

— Дык ён-жа з Эн-Ка-Вэ-Дэ. Ён не ашукае. — Жанчына, відаць, заспакоеная, пайшла да дзвярэй. — Сядай, вучы, што ў школе задалі, — кінула яна з парога дачцы і зачыніла за сабой дзверы.

---

13 красавіка ў 10 гадзін раніцы міліцыянер чыгуначнай міліцыі тав. Карбоўскі, Іван Фірсавіч, прыняў дзяжурства па апаратыўнаму пункту ст. Бярэзіна. Тав. Карбоўскі да дзяжурства добра адпачыў, выспаўся і зараз адчуваў сябе добра. У 10 гадзін 33 мінуты павінен прыбыць цягнік № 90 на Харкаў. Памочнік дзяжурнага пайшоў сустрэць яго, а тав. Карбоўскі яшчэ раз агледзеў сябе ў люстэрка: ці чыста і ахайна ён апрануты і ці добра паголены. З люстэрка на Карбоўскага глядзеў малады, чырвонашчокі твар з задорнымі шэра-блакітнымі вачыма. Карбоўскі прывёў у поўны парадак свой стол і, у чаканні звароту памочніка, прайшоўся па пакоі ў самым радужным настроі. Карбоўскаму сёнешні дзень здаваўся сонечным і радасным, нягледзячы на тое, што ў вакно хвастаў мокры снег з даждкам. Сын старога чыгуначніка Томскай чыгункі, сам да арміі чыгуначнік, а пасля арміі — міліцыянер Рабоча-Сялянскай Міліцыі, тав. Карбоўскі, не меў повада для змрочных настрояў. Іван Карбоўскі чакаў прыходу свайго памочніка цвёрда ўпэўнены, што і сёнешні дзень ён пражыве не бескарысна.

Калі, правёўшы цягнік, вярнуўся памочнік, тав. Карбоўскі пайшоў у свой звычайны абход па вакзалу. Па-сяброўску прывітаўшыся з дзяжурным па станцыі і ветліва кіўнуўшы, як старому сябру, дзяўчыне ў газетным кіёску, Карбоўскі зайшоў у зал І класа. З дзесятак пасажыраў сядзела на канапах. Некаторыя дрымалі, некаторыя проста сумавалі. На Карбоўскага ніхто не звярнуў ўвагі. Толькі адзін, што сядзеў справа ад дзвярэй, хутка паглядзеў на міліцыянера і ўтаропіўся ў газету, загарадзіўшыся ёю ад позірку ўвайшоўшага. На секунду Карбоўскі затрымаў на ім позірк. Каўнер бобрыкавага паліто настаўлен. З-пад кепкі ўважлівыя вочы глядзяць не на старонкі «Красной Звезды», а на ўвайшоўшага міліцыянера Карбоўскага.

— Цікава... — мільганула ў мазгу Карбоўскага. Ён ужо ва ўпор стаў разглядаць сядзеўшага. Той, не спяшаючыся, згарнуў газету, паклаў яе ў кішэню і, не сустракаючыся позіркам з міліцыянерам, узняўся і накіраваўся у пакой буфета.

— Чаму гэта? Усе сядзяць, а ён выходзіць, — Карбоўскі пайшоў за незнаёмым. Той узяў у буфеце каўбасы, стопку гарэлкі, бутэльку морсу і прысеў за столік. Карбоўскі сеў за суседнім сталом насупраць. Апетыту ў незнаёмага не было і ўсё-ж ён праз сілу, так-сяк, еў. Міліцыянер цяпер ужо не спускаў з яго вачэй. — Хвалюецца. А чаму? Трэба асобу праверыць.

Незнаёмы скончыў есці і пайшоў з буфета. Карбоўскі ўстаў і пайшоў за ім. Той перайшоў у залу II класа.

— А калі я памыліўся? Пакрыўдзіцца грамадзянін, чаго прычапіўся — скажа. Не! Не можа быць. Дарэмна хвалявацца не будзе, — і, рашуча падышоўшы да незнаёмага, Карбоўскі голасна, спакойна спытаўся:

— Вы адкуль і куды едзеце?

Выявіўшы на твары неўразуменне, незнаёмы павольна агледзеў міліцыянера з ног да галавы, спакойна закурыў папяросу, патушыў запалку, азірнуўся навакол, шукаючы, куды-б кінуць, і толькі кінуўшы запалку ў урну, адказаў:

— Еду з Глускага раёна ў Азова-Чорнаморскі край. А ў чым, уласна кажучы, справа?

— Прашу вас, грамадзянін, прайсціся са мною ў аперпункт.

— Чаго? — незнаёмы спакойна ямчэй усеўся на канапе і выклікальна глядзеў у твар міліцыянера, павольна выпускаючы дым праз левы кут рогу.

— Мне патрэбна з вамі пагутарыць. Яшчэ раз прашу вас прайсціся са мною. — Іх размова ўжо прыцягнула ўвагу знаходзячыхся ў зале. Да іх з цікаўнасцю паварочвалі галовы.

— Я сам тут. Глядзіце, калі ласка, устанаўляйце, а з вамі мне ісці няма чаго і няма куды. Мне яшчэ трэба білет узяць, хутка каса адкрыецца, а потым у горад сходзіць.

— Я вам яшчэ раз прапаную пайсці за мною, — Карбоўскі ўжо не сумняваўся, што перад ім сядзеў злачынец, які хваляваўся не без прычыны.

— Я не пайду. Мне там няма чаго рабіць. — і незнаёмы, зрабіўшы абураны твар, узняўся, збіраючыся пайсці.

— Грамадзянін! Я вам загадваю ісці за мной. Ідзіце наперад!

Твар Карбоўскага стаў суровым. Вясёлыя іскаркі ў вачах пагаслі. Вочы іх сустрэліся. Не вытрымаўшы позірку міліцыянера, невядомы папраўіў аберуч кепку і глыбока запхнуўшы рукі ў кішэні, працадзіў скрозь зубы:

— Ну, і што вы хочаце гэтым пасесці? Пойдзем, сходзім, калі я вас так зацікавіў.

Выйшлі на перон. Невядомы хутка азірнуўся па баках. Відаць, шукаў, куды-б кінуцца бегчы.

— Вы што азіраецеся? Шукаеце каго-небудзь?

— А што? Глядзець нельга?

— Не, чаму-ж? Можна. Толькі я тут не бачу вашых знаёмых. Ідзіце наперад. — Голас міліцыянера гучаў рэзка, а ў мазгу мільгала: — А калі дарэмна? І пападзе-ж мне за беспадстаўнае затрыманне грамадзяніна!.. О-ох і ўляціць! Не! Не! недарэмна. Пачаў, дык ужо канчаць трэба. І ўголас:— Сюды, грамадзянін, налева.

Яны ўвайшлі ў дзяжурны пакой.

— Садзіцеся, — Карбоўскі паказаў на крэсла і сам прайшоў за стол. — Як ваша прозвішча?

— Вось мае дакументы, — незнаёмы працягнуў міліцыянеру пашпарт і воінскі білет.

— Курс?

— Курс, Аляксандр Цімафеевіч, — пацвердзіў затрыманы.

— Таварыш дзяжурны, толькі-што мне перадалі вось гэта. — Памочнік дзяжурнага працягнуў Карбоўскаму спіс. Трэцім зверху ў ім стаяла — «Курс, Аляксандр Цімафеевіч».

Карбоўскі ўстаў, паклаў руку на адшпіленую кабуру. Незнаёмы ўважліва назіраў за ім.

— Рукі ўгору, грамадзянін!

Твар незнаёмага здрыгнуў, але застаўся спакойным. Толькі жаўлакі на сківіцах напяліся. Ён паступова ўзняў рукі.

— Абшукайце, памочнік.

6 пашпартаў, 3 воінскіх білеты, флакон з вадкасцю для змыўкі чарніла, туш, пер'і, чыстыя бланкі з пячаткамі і штампамі, — такія былі рэзультаты вобыску. Па меры таго, як усё гэта выцягвалася з кішэняў і другіх больш патаемных мясцін, твар незнаёмага бляднеў. Ужо не хаваючы хвалявання, ён запытаўся ў міліцыянера:

— Выходзіць, папаўся?

Адказу не было.

Канваіравалі затрыманага ў Менск тав. Карбоўскі і другі міліцыянер тав. Грэчухаў. На адной з станцый, калі яны вывелі шпіка з вагона, каб перасесці ў другі поезд, ён два разы спрабаваў уцякаць. Прышлося пад-рукі ўзяць, давесці да вагона.

Пасля допыту ў НКВД бандыт, нервова, грызучы муштук пагаснуўшай папяросы, працадзіў скрозь зубы:

— Так глупа засыпаўся!..

—...Гэта ў тым выпадку, калі прызнаць, што вы самі разумны...

— Цяпер бачу, што гэта не так..

— Позна.

Нарком унутраных спраў БССР тав. Б. Д. Берман узнагарадзіў тав. Карбоўскага каштоўным падарункам.

МІХАСЬ КАЛАЧЫНСКІ

ПРЫГОДЫ ДВУХ ТАВАРЫШАЎ

(Урывак з паэмы для дзяцей „КОСЦЯ ЧЭКІСТ“)

— Я знаю, дзе водзяцца дзятлы,
Гняздо іх знайшоў у дупле.
Жадаеш, дык раніцай заўтра
Мы сходзім па птушак у лес.—

Цішком, па сакрэту, гаворыць
Таварыш-юнат Кастусю.

. . . . :

Кукуе зязюля над борам,
Сініцы п'юць з лісцяў расу.

Сваё перазімкі вавёрка
Знаходзіць у старых дуплах,
На дрэвы ўзбіраецца вёртка,
Па выгнутых скача суках.

Над лесам магутным узмахам
Узняўся драпежлівы птах,
Маленькія птушкі са страху
Хаваюцца ўміг па кустах.

— Глянь—мішка! — таварыш
прамовіў,—
У верас, ды мёртвым ляжы!
— Мы гэтага мішку уловім,
Чакай, не бяжы.

Пасталі сябры каля дрэва
І сочаць мядзведзя цішком.
Ад іх недалёка улева
Прабегла лісіца трушком.

Як бондар, пастуквае дзяцел
Сваім далатом па сасне.
Варона сівая дзіцяці
Сняданне у дзюбе нясе.

Драпежнік пагнаўся за пліскай,
Хапае яе на-ляту.
Сябры падкрадаюцца бліска,
Як мышы к ляному кату.

—Зусім не мядзведзь гэта лезе,
А самы сапраўдны шпіён...
Блукаў, мусіць, ноччу па лесе,
А зараз хаваецца ён.

Глядзі, вунь і маска на твары,
За поясам лыжка вісіць...—
Паказвае Косця. Таварыш
К яму прытуліўся, глядзіць.

— Па стрэльбу! Тады ён пазнае!
От страху шпіёну дамо!—
І Косця сябра пасылае
Па бацькаву стрэльбу дамоў.

Хто-ж на дрэве?

Пад поўдзень бор вясёлы
Сцішае галасы.
Лятуць з калодаў пчолы
На травы, верасы.

Сядзяць на дрэвах птушкі,
Схаваўшыся ў цяні,
І яблыкі-лясушкі
Цяпер дзяўбуць яны.

Бяжыць таварыш Косцяў
Сцяжынкаю лясной,
Нясе таварыш Косцю
Берданку за спіной.

. . . .

Узяў у рукі зброю
Адважны піонер:
З задачаю сваёю
Ён справіцца цяпер.

— Ану! Злязай, пачвара!
Даволі там сядзець,
На нашыя абшары
Зайздросліва глядзець.

Хутчэй! Чаго марудзіш?!
Хутчэй на дол злязай!
А не, дык вось што будзе...—
Ён стрэльбу паказаў.

Тым часам на сасонку,
На дзіва хлапчукоў,
Узляцелі пчолы звонка
Устрывожаным клубком.

— Чур! Не пашкодзьце пчолам,
Спужаеце рая!—
Пачулі дзеці голас
Суседа-пчаляра.

І раптам ён завойкаў,
Высока на суку—
Са злосці яго пчолка
Ужаліла ў руку.

— Зрабіў улоў я, дзеці,—
Пахвастаўся сусед,—
Абмазаў мёдам вецце,
І рой прыблудны сеў...

Ішоў дадому радам
З рэбятамі пчаляр
І гаварыў рэбятам:
— Такі ў шпіёна твар:

Ён мае маску—ласку,
Калі ў народ брыдзе...
І расказаў тут казку
Малым рэбятам дзед:

Казка пчаляра

Як настане толькі ліпень,
Пад вакном квітнеюць ліпы,
У палях бялее грэчка,
Цвітуць травы каля рэчкі;

Адцвітае лён зялёны,
Зацвітае мак чырвоны...
Краскі ўсюды, ўсюды кветкі
Пахнуць пожні, луг, палеткі...

Раннем сонечным вясёлым
Вылятаюць з вулляў пчолы:
І за рэчку,
І на грэчку,
На каліну,
Аржавіну,
І збіраць мядовы сок
На пахучы верасок.

Апусцеў прыют пчаліны...
Уваход вартуюць пільна
Тры дарослых, тры малых —
Сама смелыя пчалы;

Вось дачуўся труцень ласы,
Што ўсе пчолы на папасе,
Свой куток пакінуў—цень—
І да вулляў паляцеў.

Прыляцеў ён да калоды—
Ля калоды пахне мёдам,
А даўно ў калодзе быў!
А даўно мёд смачны піў!

Ледзь ступіў ён на парог,—
— Стой!—крычаць яму утрох.
Ці даўно цябе сям'ёй
З хаты выгналі сваёй?

— Ты чаго-ж вярнуўся зноў?
Ты за чым да нас прышоў?
Каб не мець ніякіх бед,
Убірайся, дармаед!

Забаяўся труцень крыку,
Паляцеў з плаклівым зыкам.
Змардаваны, ціхі, сумны...
Увесь дзень ён думы думаў,
Што тут мудрае знайсці,
Каб у вулей упаўзці?

Доўга думаў і рашыў —
Нанаў вопратку пашыць
Са сваёй старой апраткі
На такую, як у маткі.

Усіх сабраўшы дармаедаў:
Мух, казюлек, караедаў,
Шыць сабе прымусіў ён
Маску—новы балахон.

Госці злыдню пакляліся
Ды за працу узяліся:
Хто сукае з лёну нітку,
Хто старую рэжа світку;

Войстраць ножніцы, іголкі—
Працы, клопатаў тут колькі!
Адзін труцень, злыдзень, сам
У баку сядзіць, як пан.

Вось заціх і шум і звон—
І гатовы балахон.
Яго труцень тут надзеў,
Зноў да пчолак паляцеў.

Ледзь ступіў ён на парог—
— Ты куды?—крычаць утрох.—
— Зноў па соты, зноў па мёд,
Ах, ты злодзей, руды чорт?!

Хочаш пчол ты абхітрыць,
Працу нашую спажыць?
Не удасца абхітрыць,
Працу нашую спажыць!

Пчолы злыдня тут схапілі!
За прытуленыя крыллі,
Моцна, моцна гайданулі,
Ды на дол з вулля кульнулі.

Паляцеў, не з'еўшы мёду,
Ён без крылляў пад калоду.
Паляцеў і больш не ўстаў,
І ў той-жа дзень сканаў.

**

Пасцігайце, мае ўнукі,
Дзеда добрага навуку:
Беражыце нашы долы,
Як любімы дом свой пчолы.



«Пагранічнік». Карціна вучня мастацкага вучылішча сяла Палех В. Зіноўева. (СФ.)

М. ДЗЕХЦЯР

БУСЛЫ

На самым высокім дубе бусел звіў сабе гняздо і жыў прыпяваючы. Унізе навакол па неабдымных абшарах расплываюцца вялізныя пляміны—заімшавелыя балоты. Прыпяць у розныя поры дня пераліваецца ў розныя колеры. Па яе берагах шуміць высокі ачарот. І зборышчы ніцых вербалоз з падмытым карэннем, з абвіслымі галінамі, адбіваюць паклоны вадзе і быццам моляць-просяць.

— Не крыўдуй нас, залаценькая Прыпяць, наша жыццё на валаску вісіць... Не губі нас, любая рака...

А бусел з гары пазірае на ўсё гэта, і яму хоць-бы што! Ён стаіць спакойна ў гняздзе, штохвіліну прабуе моц сваёй дзюбы, сыты па горла.

Мяне ніхто не чапае. Ад дуба да рэчкі далёка. Я ні перад кім шапкі не знімаю.

Ні ў адной мясціне на ўсім свеце, ні адна птушка на зямлі не мела такой раскошы, як бусел у нас. Дзе-ж вы знойдзеце гэтулькі балот? А колькі ў нас жыўнасці. Палюй ды палюй, і ніколі канца краю не будзе жывым трапяткім жабам і вужакам.

— Еж, хоць покайся!

Павольна і паважна, як зэсар, дыбае доўганогі птух па бязмежнай дрыгве. Пад яго закарузлай лапкай зыбаецца багна. А раптам як тыцне доўгімі абцугамі ў зялёную зыбуху, ірване ўгору — і гатова смачная вячэра. Будзь ласкаў, частуйся. Малыя бусляняты махаюць крыламі ды ірвуць з яго дзюбы на шматкі жывую жабу.

А навакол у дубняку гойдаецца на вяршынях вялікае паселішча доўганогіх птухаў — буслевае царства.

Яшчэ пэ сёння памятаю буслевае паселішча высока ў небе, недалёка ад нашага мястэчка. Старога бусла-атамана (так мы яго называлі) бачу нібы во перад вачыма — магутнакрылага, распасцёртага ў лёце ў празрыстым нябесным акіяне. Здалёк, на вялікай адлегласці, мы яго пазнавалі, узнімалі рукі ўгору.

— Вунь-вунь... наш! Імчыцца, нібы страла. А ў дзюбе нясе пугу. Цюга... цюга... атаман...

— Бусел! Бусел! Твой палац гарыць!

Я ніколі не забуду буслоўвага паселішча. Спаміж тысяч іншых я пазнаў-бы старога атамана.

Кажуць, што старога атамана даўно на свеце няма.

**

У летнія адвячоркі на захадзе сонца стары атаман стаяў у сваім гняздзе з горда ўзнятай дзюбой і ўсё буслоўвае царства рабіла тое самае, і ў неба тырчала безліч завостраных пік. Апошнія праменні пераламліваюцца на доўгіх бусловых цыбах. Дубы цямнеюць і гусцеюць і на дубовых лістах, нібы мядзяныя кругляччкі, яшчэ дрыжаць апошнія пырскі сонца.

Гіргочуць, гіргочуць буслы, узмахваюць, узмахваюць крыламі і раптоўна застываюць. А калі стары атаман хавае ў гняздзе сваю вострую піку, тады навакол ныраюць у змроку ўсе дзюбы. З кожнай хвілінай становіцца цішэй і цішэй, пачынаюць закалыхвацца на сон бусловыя гнёзды.

Неба, засеянае зоркамі, ляжыць над бусловым паселішчам і сыпле жмені залатога маку ў дрымотныя гнёзды.

Ціха і соладка спіць палескі птух.

**

Хто-ж гэта паліць агні на балотах? Хто-ж гэта ўстрахнуў багну аж да самага дна?

— Бальшэвікі!

У гумовых ботах і ў гумовых плашчах, з вялізнымі лапатамі за плячыма наступілі яны на спрадвечную адхлань і растрывожылі яе бяздонне. З вёсак і мястэчак ішлі сюды дружныя атрады. З сваіх хат прынеслі рыдлёўкі, торбы з хлебам-салам.

Пасля дня працы ў каналах, пасля дня ўпартай бітвы з балотнай жыжай вельмі зручна спаць у брызентавых палатках. Сняцца прыгожыя і вязўнічыя сны. Нібы хтосьці весела спявае ў сне.

Не павуціннем затканы паляшуцкія хаты. Не лучыны дымяць у лучніках, не слепіць вочы пры прасніцы паляшучка. А дзеці не кешкаюцца пад сталом у брудзе і гразі.

На стале — накрыты белым вышываным ручніком вялікі бохан хлеба. З печы зіхаціць вясёлы агонь. На скавародзе сквіргочуць вялікія кавалкі сала. І смачны пах ласкоча ў ноздрах, не тоўпіцца ў хаце і пераліваецца праз берагі.

Агеньчыкі, агеньчыкі, агеньчыкі. Лямпачкі, лямпачкі, лямпачкі — па дарожках і сцяжынках.

Якія абшары палёў! Якія багатыя ўраджаі!

— Дзе падзеўся край галадухі і тугі?

— Дзе падзеўся край буслоў і жаб?

— Дзе падзеўся край тужлівых лазовых свісцёлак?

Усю ноч палаюць агні навакол балот. Цягне вільготным подыхам. І ў толькі-што выкапаных каналах цячэ і хліпае брудная жыжа, мінулы боль тутэйшай зямлі. Буслоўвыя гнёзды шурхаюцца ўначы. Разбуджана буслоўвае паселішча. Даўно стаіць на варце на адной назе стары атаман. Шмат пер'яў ляціць з гнёздаў.

— Што тут дзеецца?

На вяршыні дуба высіцца ўстрывожаны стары атаман. Ён адзічала касавурыцца ў высокае сіта неба, таропіць спалоханы позірк уніз.

Неба — як заўсёды неба, але на зямлі чыніцца нешта дзіўноснае.

Адкуль успыхнулі яркія сляпіцы вогнішча на балоце ў глухамань ночы? Чаму так хліпае вада? Чаму так квола і рэдка квакаюць жабы?

Думу думае стары атаман і дадумаць не можа. Яго галава ходырам ходзіць. Ён збянтэжана ўзлятае ў неба і ныраре і ныраре імпэтна ў ноч. Ён кружыцца, аслеплены, нізка над вялізнымі вогнішчамі — вось-вось крыллі апячэ.

— Чаму-ж гэта жабы голас страцілі?

Шмат застылых мёртвых вачанят пазіраюць на яго з разгойданых балот і палохаюць. З шырока разяўленай смяглай дзюбай ён доўга лунае над імшыстай багнай і нібы шукае, шукае свае ўласныя сляды.

Гэтулькі гадоў ён гаспадарыць на дрыгве, гэтулькі гадоў ён на балоце пан над панамі — найвялікшы палескі птух...

Ён кружыцца, устрывожаны, і ў роспачы крыламі лапоча, быццам чорт з старадаўняй палескай байкі.

— Гінуць жабы. Ад галадухі прыдзецца малаціць пустой дзюбой.

Шмат застылых мёртвых вачанят пазіраюць на яго з вадзяных балот. Дрыж прабірае старога атамана і ён лапоча крыламі, быццам чорт з старадаўняй палескай байкі.

**

Гавораць, што ў кожную восень перад выраем буслы вясёлы баль ладзілі, акурат як на вяселлі. Якраз тады жабы пачыналі зімовую спячку. Перад адлётам буслы будзілі іх і прыязна з імі развітваліся.

— Мы яшчэ вернемся, яшчэ пабачымся з вамі, сваты любыя. Спіце на здароўейка!

Аж на тры дні буслы запасілі ежу і тры дні елі, і елі па горла, і кідалі згары рэшту — у нутро не лезла...

А пасля густы вырай птушак засланяў неба і разгортваўся ў даль доўгім ланцугом, а наперадзе заўсёды лётаў стары атаман, ганаровы бусел.

Пустыя і запушчаныя заставаліся заўсёды на калматых галовах дубоў бусловыя гнёзды. Поўгода ніхто да іх не наведваўся, ніхто здабычы не прыносіў.

Бяздомная восень тулілася да буслоўвых пер'яў, што заставаліся ў гнёздах, і калючыя замаразкі зацягвалі ваколіцу бляшанай плахтай.

У бусловым паселішчы небывалая цішыня. Ніхто не прылятае. Ніхто здабычы не прыносіць.

Але ў адну восень буслы балю не ладзілі (не да гэтага было). Не гулялі вяселля ў бусловым паселішчы. Сам-на-сам смуткаваў, стоячы, стары атаман і доўга трымаў апушчанай уніз дзюбу. У неба ён пасылаў сум сваіх вачэй. Восеньскае неба яму спачувала і сыпала кроплямі.

Пасля ён доўга лунаў над ранейшымі старымі мясцінамі, шукаў імшыстыя журавінныя купіны, застылыя прорвы балотнай квашаніны.

Ужо даўным-даўно пара ў адлёт, а ён усё яшчэ кружыцца навакол і шукае і сноўдае, ставіць нагу на даўнейшую зыбуху — і яго бярэ млосць. Ён атрасае пясок з лапак, зноў парываецца ўгору — і зноў апускаецца, і яшчэ раз мацае лапкай — аж гнеў кіпіць — сухі пясок.

— Нешта цвёрда пад нагамі. Чаму не зыбіцца?

Ён укалоў дзюбу ўніз і выцягнуў яе сухую, з зернем у канцы. Ён выплёўвае зерне, па-разбойніцку азіраецца і запарушвае зерне пяском.

З бусловага паселішча чуваць стукатанне дзюбаў, лапатанне крылляў і дзікі гіргат.

— Пара ў адлёт, атаман!

— Лепш, атаман, ці застанешся? І без цябе справімся — турук, турук!

Атаман усё яшчэ кружыцца над высокімі скірдамі дабра. І страх яго бярэ сярод стагоў сытасці, і ён выглядае маленькім і бяздольным.

Па яго, нібы жывыя, наступалі скірды, насупіўшыся залатымі каласамі, і хмяліў адусюль сытны пах жыта і пшаніцы.

Пасля ён стаяў, няўпэўнены, у старым гняздзе і ўсё яшчэ пасылаў у неба смутак сваіх вачэй. Сцюдзёны вецер трос вяршыню старога дуба і калыхаў гняздо з буслам. І краталі і стагналі дубовыя галіны, і сыпалі жменямі пажоўклых лістоў, і стралялі жалудамі, нібы кулямі, уніз. І апускаецца зверху пер'е за пер'ем, апускаецца, апускаецца...

І ў пахмурным небе маладое бусловае веча павольна расцягвалася ў ланцуг. Восень слухала шумны ўзлёт крылляў і, нібы адуванчыкі, мітулыгалася ўніз белае бусловае пер'е.

Гэта была першая восень, калі ў вялікім выраі неставала старога атамана.

Пераклаў з яўрэйскай мовы.
З. БЯДУЛЯ.

Е. РАМАНОВІЧ

„ДРЫГВА“

КАМПАЗІТАР А. В. БАГАТЫРОЎ ПРАЦУЕ НАД ОПЕРАЙ «ДРЫГВА» ПАВОДЛЕ АДНАЙМЕННАЙ АПОВЕСЦІ ЯКУБА КОЛАСА. ДРАМАТУРГ Е. РАМАНОВІЧ ПА МАТЫВАХ АПОВЕСЦІ НАПІСАЎ ЛІБРЭТА ОПЕРЫ. ДРУКУЕМ УРЫЎКІ З ЛІБРЭТА.

СЦЭНА 3-я.

Уваход у падвал. Чыгунныя дзверы, вакно з кратамі.

Парабкі выносяць з падвала кулі з мукой і іншае дабро.

Хор парабкаў.

Эх ты, доля, доля. Голад ты,
галота.
Не свая тут воля, не свая ахвота.
Цэлы дзень працуеш, усю ноч
гаруеш,
Ляжаш адпачыці, ой, спіны
не чуеш.

Капрал. Ну, і песню зацягнулі, лайдакі. Вось, паслухайце лепш, як спяваюць ваякі.

Умарл Мацэк, умарл. Юз лежы
на дэсцы,
Зэбысь яму заграць, падскоцыл
бы есце.

Ну, жвавей выносце панскае дабро, каб праз хвіліну там чыста было.

Хор парабкаў.

Эх, ты доля, доля... і г. д.

(Уваходзяць п'яныя Васіль і Саўка. Ідуць, трымаючыся адзін за аднаго).

Васіль. Гэй, чуеце, мужыкі? Саўка, растлумач ім, хто я ёсць такі.

Саўка. Парабкі, парабкі: войт — гэта чын.

Войт—улада,
Войт—высокая пасада.
Войта трэба паважаць,
Войта трэба шанаваць.
Хто не будзе войта слухаць,
Таго ў карак, таму ў вуха
(Парабкі смяюцца з п'янага выслаўлення Саўкі).

Васіль (гнеўна). Што? Дык вы смяецца з мяне? Вось я вас зараз.

(Схапіў кій, ганяецца за парабкамі).

Саўка (абхапіў рукою слуп, думае, што гэта Васіль). Ты не гнявайся на іх, Васіль Рыгоравіч. Што яны ведаюць, яны цёмныя мужыкі—парабкі.

Войт—гэта сіла,
Войт—гэта розум,
Войт—начальнік надта грозны.
Кожны войта ўшануе,
Дай, я войта пацалую.
(Уваходзіць Васіль, заўважае п'яныя выкрунтасы Саўкі).

Васіль. Саўка, ты што гэта, звар'яцеў?

Саўка. Я войта ўшанаваць хацеў.

Васіль. Ой, як ты ўпіўся, а я-ж за цябе панам паручыўся. Цяпер да мяне ў паноў пашана, а ці тое яшчэ будзе, калі знішчым партызанаў. Будзеш верна мне служыць, будзеш і ты па-панску жыць.

Саўка. Біць? Дзе біць? Каго біць?

Васіль. А ліха на цябе. Быць мне ў бядзе, як у чорта ў барадзе. Ідзі дадому, праспіся, ды нікому нічым не хваліся. Сапсуеш нам усю справу.

Саўка. Не сапсую, ей-права.

Васіль. Ты ўсё помніш? Нічога не забыў?

Саўка. Усё чысценька, каб я так жыў.

Васіль. Мне яшчэ дзе-куды трэба, я пайшоў.

Саўка. Ідзі сабе, будзь здароў. Ого, каб я ды забыў. (Пасля паўзы). А яно ўсё-ж цікава, аб чым ён гаварыў.

Аўгіння (уваходзіць). Татка, я вас шукаю.

Саўка. Значыць так, успамінаю. (Паказвае на ўваход у падвал). Сюды пасадзяць Андрэя.

Аўгіння. Што ты кажаш, я нічога не разумею.

Саўка. Я яго вызвалю, мы пойдзем у лес, пасля я назад вярнуся, і прывяду туды палякаў.

Аўгіння. Татка, ці пры сваім вы розуме?

Саўка. У мяне, пачушка, толькі ногі п'яныя, а галава цвярозая.

Аўгіння (у адчаі).

Каму паведаць.
Каму сказаці.
Вось маё шчасце.
Вось мая доля.
Памерла маці.
Спіўся мой бацька.
Сама ў няволі.

Саўка. Няма жыцця мне, хоць ёсць гарэлка, ды не ў ёй шчасце, ды не ў ёй радасць.

Аўгіння. З людзьмі благімі сябруеш, бацька; дабра не будзе ад вашай дружбы.

Саўка. Як-та з людзьмі? З сваім-жа зяцем? З тваім-жа мужам.

Аўгіння. Ён мне не муж.

Саўка. Вось справы чую.

Аўгіння. Пайшла я замуж, каб вам даць шчасце, хлеба кавалак, радасці крышку. Эх, дзе ты, праўда. Церпім спрадвеку. Бацькі цярпелі, дзяды цярпелі. Эх, гора, гора. Ідзем дадому.

Саўка (пяе прытупваючы).

Як пайшоў Апанас
Па гарэлку да нас.
Зачапіўся за пень,
Прастаяў цэлы дзень.
Прышла баба, адчапіла,
За гарэлку заплаціла:
Ідзі дурань, дадому,
Ды і не кажы нікому.
(Выйшаў. Варта ўводзіць Андрэя).

Андрэй. Аўгіння.

Аўгіння. Андрэй, сцеражыся бацькі.

(Легіянер яе адштурхоўвае. Андрэя ўводзяць у падвал, замыкаюць дзверы. Паступова вечарэе.

Андрэй.

Дзе-ж ты, сонца маё светлае,
Дзе схавалася.
Ты-ж за мною, мая дзяўчына,
Не віталася.
Засадзілі мяне ў краты,
Засадзілі паны-каты.
Дзе-ж ты, зорка мая ясная,
Дзе падзелася.
Супроць гвалту мая помста
Разгарэлася.
Засадзілі мяне ў краты,
Засадзілі паны-каты.
Дзе-ж вы, хлопцы мае верныя,
Што не чуеце,
Дзе, у якім бары ў лесе
Вы начуеце.
Засадзілі мяне ў краты,
Засадзілі паны-каты.
Дайце зброю мне ў рукі,
Дайце дужасці,
Паламаю, знішчу краты
Сілай-мужнасцю.



Тав. Е. РАМАНОВІЧ.

(Сцямнела. Уваходзіць капрал, паручык, Васіль і Саўка. Васіль у вайсковым убранні. Капрал кліча вартавога, дае яму загад. На месца вартавога становіцца пераапрануты Васіль. Капрал і паручык выйшлі).

Васіль. Глядзі-ж, Саўка, не падкачай. Рабі, як дамовіліся. Пачынай.

(Саўка робіць штучны напад на вартавога, пасля адкрывае дзверы падвала).

Саўка. Андрэй, ты тут? Хутчэй, бяжым.

(Яны выбеглі. Васіль падымаецца, глядзіць ім услед, і рагоча).

З СЦЭНЫ 4-й.

(Партызаны праводзяць Кузьміча. Пауза. Раптам сігнал трывогі. Шпарка ўваходзяць дзед Тарас і партызаны).

Дзед. Нехта ў лесе, трэба схавацца.

(Партызаны засыпаюць вогнішча і разыходзяцца. Пауза. Азіраючыся ўваходзяць Андрэй і Саўка).

Саўка. Мы заблудзілі, не іначай. У такім гушчары толькі з чортам спаткацца можна альбо з ваўком.

Андрэй. З чортам, з ваўком не страшна, з благім чалавекам страшней.

Саўка. Праўда твая. Яшчэ, каб была для бадзёрасці чарка гарэлкі, а так...

Андрэй. Го-го-го-го...

Саўка. Во, чуеш, анікога. Я ўжо збіўся з ног. Баюся, што назад мы дарогі не знойдзем, загінем у дрыгве. Не. Ты як сабе хочаш, а я назад.

Андрэй. Назад? Як-жа так? Адзін?

Саўка. Калі ты не пойдзеш, то і адзін.

Андрэй. І табе не боязна?

Саўка. Каго?

Андрэй. Чарцей ды ваўкоў.

Саўка. Чарцей ды ваўкоў — не, вось людзей крыху боязна, праўда.

Андрэй. Не за сваю ўзяўся справу ты, Саўка.

Саўка. Не за сваю, ой, праўда, што не за сваю. (Задумаўся). А ты што, хіба ведаеш?..

Андрэй. Я—не, я так, паміж іншым. Думаю, як гэта ты мяне вызваліў з-пад гэтакай варты. (Коса глядзіць на Саўку).

Саўка (адкапаў нагой вогнішча). Бачыш, тут вогнішча гарэла. Яшчэ гарачая зямля. Людзі тут толькі-што былі.

Андрэй. Мы на на дарозе правільнай. (Крычыць). Гэ-гэй, хто-небудзь адгукніся.

Дзед (з сякерай у руках, выходзіць з-за дрэва). Хто тут крычыць?

Андрэй. Бацька.

Дзед. Андрэй, сынок мой. (Кідаецца ў абдымкі).

Хор партызанаў. Андрэй, сын Тараса, сын камандзіра. То-ж ён быў у няволі, як ён сюды прышоў?

Андрэй. Уцёк.

Дзед. Сам?

Андрэй (паказвае на Саўку). Вось ён дапамог.

Дзед. Саўка, ты сапраўды?

Саўка (яму няёмка). Я.

Дзед (паціскае Саўку руку). Ну, дзякую табе. Во малайчына, дай я цябе пацалую.

Андрэй. Пачакай цалаваць, бацька. Ён вызваліў мяне для таго, каб прыйсці сюды і пасля выкрыць усіх нас палякам.

(Вялікая пауза. Усе глядзяць на Саўку).

Дзед (хмура). Саўка, ці-ж гэта праўда?

Саўка (пасля паўзы, цяжка). Праўда.

Дзед (грозна). Юда. Панам прадаўся. (Да партызанаў). Што-ж нам рабіць з ім, хлапцы?

Хор партызанаў. Забіць. Павесіць здрадніка. Застрэліць гада.

(Партызаны схапілі зброю, грозна насоўваюцца на Саўку).

Саўка (кінуўся на калені). Даруйце, мне, вінават перад вамі.

Хор партызанаў. Смерць яму. Смерць.

Саўка. Пашкадуйце, браткі. Не сваёй я воляй. Збіў мяне войт Бусыга. Мне сорам глядзець вам у вочы. Пашкадуйце.

Дзед (да Андрэя). Што-ж ты маўчыш, сынок. Тваё слова — прысуд, што нам рабіць з ім. Кажы.

Хор партызанаў. Праўда. Хай скажа Андрэй. Яму першае слова. Яго прысуд. Як скажа Андрэй, так і зробім.

Андрэй. Будзем судзіць. Пакуль што, няхай застанецца пад вартай. (Каля Саўкі становіцца вартавы).

Дзед (да Андрэя). Хай так і будзе. Любы мой сын, дарагі мой Андрэй. Які я шчаслівы, што ты цяпер з намі. Гэй, вогнішчы, будзем паліць. Хай гарманісты зайграюць. Песні мы будзем спяваць, будзем скакаць, весяліцца. Сёння вялікая радасць. Сына свайго прычакаў, любага сына Андрэя.

Хор партызанаў. Гэй, гарманіста сюды. Песню давай заспяваем, будзем скакаць, пагуляем. Сын, бач, да бацькі прышоў. Сёння вялікая радасць, сёння вясёлы ў нас дзень.

(Партызаны паляць вогнішча. Дзед Тарас і Андрэй селі ў круг. Заспявалі песню).

Хор.

Праз лясы, палі, загоны
Конніца ляціць чырвоных,
Нішчыць панскі строй.
Ляцяць, скачуць эскадроны,
Сцягі ўюцца Першай Коннай,
Песня кліча ў бой.
Песня мчыцца праз загоны
З Волгі, з-за Дняпра і Дону.
Коннікі пяюць.
Гэй, дрыжыце, паны-каты,
Хутка вам галовы й пяты
Шабляй пасякуць.
К пану-богу ўцякайце,
Шапкі, стрэльбы не губляйце,
Разлуецца ён
Над лясамі, над палямі,
Ляцяць коннікі арламі,
Нішчуць легіён.
Сціхлі буры-гураганы,
Сціх і вецер апантаны,
Дагарэў агонь.
Праз лясы, палі, загоны
Конніца ляціць чырвоных—
Рвецца ў бойку конь.
(Песня пераходзіць у танец).

ЗАСЛОНА.

Вацлаў Вацлававіч ВАРОЎСКІ

(Да 15-годдзя з дня смерці)



10 мая 1923 года ад рукі подлага фашысцкага забойцы, які страляў з-за вугла, паў на баявым пасту Вацлаў Вацлававіч Вароўскі. Загінуў палкі большэвік, які аддаў усё сваё жыццё справе рабочага класа, справе комунізма.

Таварыш Вароўскі нарадзіўся ў Маскве ў 1871 годзе ў сям'і інжынера-чыгуначніка. З дзяцінства Вацлаў Вацлававіч увабраў у сябе ненавісць да царызма, які прыгнятаў народы Расіі. У школе ён прымае ўдзел у гуртках, а ў студэнцкія годы сам арганізуе рэволюцыйныя гурткі студэнцтва.

У 1895 годзе Вароўскі пачынае весці прапагандысцкую работу сярод рабочых горада Масквы. Царская паліцыя хутка звяртае ўвагу на маладога рэволюцыянера і ў 1895 годзе ён высылаецца з Масквы на 3 месяцы ў Валагодскую губерню. Пасля звароту з ссылкі ён зноў актыўна прымаецца за рэволюцыйную работу, у другі раз арыштоўваецца ў 1897 годзе і пасля двухгадовага турэмнага зняволення яго накіроўваюць у 1899 годзе ў ссылку на тры годы ў Вяцкую губерню. Ні турма, ні ссылка не зламілі маладога рэволюцыянера.

Вясною 1902 года, па сканчэнні тэрміна ссылкі, Вароўскі выязджае за граніцу. Пасля другога з'езда партыі ў 1903 годзе, на якім адбыўся раскол паміж большэвікамі і меншавікамі, Вароўскі рашуча становіцца ў рады большэвікоў.

Пасля адбыцця ссылкі Вароўскі ў 1915 годзе выязджае за граніцу ў Стакгольм. Пасля лютаўскай рэволюцыі ён увайшоў у заграпічнае бюро ЦК большэвіцкай партыі.

Пасля перамогі Кастрычніцкай рэволюцыі ў Расіі Вароўскі прызначаецца першым совецкім паўпрэдам ў Скандынаўскіх краінах. У пачатку 1919 года ён прызначаецца за загадчыка дзяржаўным выдавецтвам. Неўзабаве Вацлаў Вацлававіч зноў пасылаецца партыяй і ўрадам на дыпламатычную работу. Дзякуючы свайму вялікаму розуму, выключнай адукаванасці, рэволюцыйнай большэвіцкай страснасці, ён на гэтай рабоце праяўляе сябе як выдатны дыпламат-большэвік. У 1921 годзе Вароўскі прызначаецца паўпрэдам у Італіі. У 1922 годзе ён прымае ўдзел у работах Генуэзскай канферэнцыі. У 1923 годзе ён накіроўваецца дэлегатам совецкага ўрада на Лазанскую канферэнцыю і тут яго насцігае куля фашысцкага забойцы.

Забойства гэта было не выпадковым актам фашысцкага вырадка - адзіночкі. Рука забойцы накіроўвалася фашысцкай лігай Обера, ніці якой цягнуліся ў рад еўрапейскіх сталіц да вярхоў фінансавага капітала — каралёў нафты, жалеза. Гэта яны, выступаючы праз падпарадкаваныя ім урады, спрабавалі на Лазанскай канферэнцыі навязаць Турцыі рабаўнічы дагавор. Прысутнасць совецкай дэлегацыі на гэтай канферэнцыі блытала карты капіталістычных дзялкоў. Дэлегацыя совецкай дзяржавы, цвёрда праводзячы лінію большэвіцкай дыпламатыі, выступала ў абарону прыгнечаных народаў. Вось чаму цёмныя сілы фашызма і рэакцыі арганізавалі з-за вугла гнуснае забойства выдатнага дыпламата-большэвіка.

Выязджаючы на канферэнцыю ў Лазанну, Вароўскі атрымаў усе неабходныя візы і меркаваўся, што швейцарскім урадам будуць прыняты меры да аховы совецкай дэлегацыі. Аднак, гэта зроблена не было. З першага дня паяўлення Вароўскага ў Лазанне друк і фашысцкія элементы павялі супроць яго наглую кампанію, пагражаючы яму забойствам, калі ён не пакіне Швейцарыю.

9 мая 1923 года, за дзень да смерці, Вароўскі пісаў у Народны камісарыят унутраных спраў: «Мы сядзім тут у якасці наглядальнікаў. Аднак, нас хочуць выжыць, калі не мыццём, дык катаннем». І далей, апісваючы праявакацыю і пагрозы па адрасу совецкай дэлегацыі, Вароўскі паведамляў: «Паводзіны швейцарскага ўрада ёсць ганебнае парушэнне дадзенай у пачатку канферэнцыі гарантыі, і ўсякі напад на нас у гэтай «архіблагаустроенной» краіне магчым толькі з ведама і патурання ўлад».

Нягледзячы на пагрозы і правакацыю, Вароўскі прадоўжваў стойка стаяць на пасту і на гэтым пасту ён быў забіт.

У асобе Вароўскага адышоў ад нас стойкі большэвік, непахісны рэволюцыянер, бліскучы публіцыст і дыпламат, паслядоўны праваднік совецкай палітыкі міру.

У асобе Вароўскага адышоў ад нас выдатны крытык-марксіст, страснае слова якога да апошняга радка было накіравана на сцвярджэнне ўрачыстасці пролетарскай культуры.

Імя таварыша Вароўскага назаўсёды застанецца ў памяці нашай большэвіцкай партыі у памяці народаў Совецкага Саюза, за шчасце якіх ён змагаўся на працягу амаль трыццаці год сваёй рэволюцыйнай работы.

3-я УСЕБЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ПРАМКААПЕРАЦЫІ

Тры дні, з 17 па 20 красавіка, праходзіла трэцяя алімпіяда мастацкай самадзейнасці прамкааперацыі БССР. Гэта было ўнушальнае і яркае відовішча, якое яшчэ раз сведчыла пра росквіт культуры працоўных мас, немыслімы нідзе, апрача нашай вялікай радзімы.

У мінулым многія з удзельнікаў алімпіяды былі дробнымі рамеснікамі, саматужнікамі-адзіночкамі. Яны былі разрознены, вялі мізэрнае існаванне і знаходзіліся на нізкім культурным узроўні. Толькі соцыялістычная рэволюцыя, партыя і совецкая ўлада далі саматужнікам, як і ўсім працоўным, новае жыццё, адкрылі ім шлях і да творчай дзейнасці. Цяпер прамысловая кааперацыя БССР налічвае да 7 тысяч удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, з іх 650 чалавек выступалі на трэцяй усебеларускай алімпіядзе.

Адзін з самадзейных калектываў назваў сваё выступленне—«выступленнем трох пакаленняў». Гэту назву можна распаўсюдзіць на ўсю алімпіяду, на якой былі прадстаўлены ўсе ўзросты.

Першая цікавая рыса самадзейнасці прамкааперацыі — масавасць, арганізацыя буйных мастацкіх калектываў: танцавальных, аркестровых, харавых, што трэба ўсяляк падтрымліваць і пашыраць. Паказальны факт пастаноўкі Менскай культбазай першага акта балета «Чырвоны Мак» Гліэра. У пастаноўцы выявіліся паасобныя вельмі здольныя ўдзельнікі балетнага калектыва (Гуртоўнік, Фрыдман, Гардон і інш.).

Другая каштоўная рыса алімпіяды—народнасць, работа над фальклорам БССР і братніх рэспублік, работа над песенна-танцавальнай народнай творчасцю. Не было амаль ні аднаго калектыва, які-б так ці інакш не выявіў гэтага. Маляўнічы, яркі, сапраўды народны характар насілі выступленні харавога ансамбля шклоўскага клуба прамкааперацыі («Частушкі аб Ежове» і калгасныя частушкі), жаночага хора веткаўскай арцелі «Пролетарый» («Кукавала зязюленька» і «Так-сяк мне да вечара дажыць») ансамбля песні і пляскі тэкстыльшчыкаў Гомеля, танцавальных калектываў Віцебска, Хойнікаў, Бабруйска, Менска і інш. Асабліва трэба адзначыць «Лявоніху» у выкананні Бабруйскага калектыва, «Гапак» (Віцебск), «Мяцеліцу» (Хойнікі), «Юрачку» (Гомель), казачок «Дзевятка» (Бабруйск), вельмі цікавы танец «Лянок» у выкананні калектыва Рудзінскай торфарцелі.



Калектыў мастацкай самадзейнасці арцелі «Гомтэкстыль» выконвае беларускі народны танец «Юрачка».

Фота В. Грунтфеста.

Танцавальныя калектывы паказалі таксама наяўнасць у іх асяроддзі здольных выканаўцаў. Гэта браты Партновы (Віцебск), Старадубаў (віцебская арцель «Хімік») і інш.

Нельга не вітаць і стварэнне музыкальных аркестравых калектываў, напрыклад, домравага аркестра бабруйскага клуба прамкааперацыі, струнных гурткоў Менска, Віцебска, стварэнне даволі моцных духавых аркестраў і джазавых ансамбляў у Менску і Бабруйску.

Сярод адзіночак вакальна-музыкальнага жанра алімпіяды трэба раней за ўсё адзначыць тав. Сайкова (Гомель) які ўладае добрымі галасавымі данымі (драматычны тэнар), музыкальнасцю, удумлівым і жывым выкананнем (Серэнада Дон-Жуана Чайкоўскага, «Капітаны паветраных марэй» Дунаеўскага). Тав. Сайкову неабходна падумаць аб сістэматычнай вучобе.

Вельмі музыкальна і выразна выканалі свае нумары—дуэт банджо і гавайскай гітары—Левін і Кудрашоў (Віцебск). Тэхнічна ўмела, проста і шчыра выканаў на кларнеце смалакур тав. Скараход з Рэчыцы «Каўказскі чабан». Нядрэнна ўладае скрыпкай таварыш Леопскі (Барысаў), які паказаў добрую работу па аўладанню класічнай спадчынай («Музыкальны момант» Шуберта, «Гавот» Люлі).

Алімпіяда падкрэсліла вялікую ўвагу і любоў да самадзейнасці раду арганізацый прамкааперацыі як у Менску, так і ў раёнах. Асабліва хочацца спыніцца на віцебскім клубе прамкааперацыі. Выступленні калектываў гэтага клуба вызначаліся культурнасцю, сур'ёзнасцю і прадуманасцю.

Алімпіяда паказала і рад недахопаў. Некаторыя кіраўнікі амаль не падрыхтаваліся да алімпіяды, не зрабілі адпаведнага адбору выканаўцаў, у сувязі з чым якасць выступленняў была на невыстарчальным узроўні (віцебская арцель «Хімік»). Некаторыя арганізацыі пад выглядам самадзейнасці спрабавалі працягнуць прафесіянальных выканаўцаў (Менск, Бабруйск). У радзе выступленняў пастаноўшчыкі парушалі народны характар, твораў, стылізавалі іх, прычэсвалі, атрымлівалася надуманасць, няшчырасць (танцы менскай арцелі «Чырвоны абутнік»). Некаторыя ўваскрашалі даўно забытыя «сінеблузныя» прыёмы (віцебская арцель «Хімік») альбо несур'ёзна падыходзілі да ідэйнага боку выступленняў (карыкатурны лубок Менскай культбазы). У выступленнях аркестровых калектываў (Бабруйск) адчувалася недастатковая зрэпетыраванасць, аднастайная падача твораў, нястройнасць. Выявілася і слабая работа з адзінкамі.

Белкаапрамсаюзу трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу на забеспячэнне гурткоў кіраўнікамі, на метадычнае кіраўніцтва, на далейшае пашырэнне і паглыбленне мастацкай самадзейнасці. Рад каштоўных і цікавых выступленняў многіх калектываў і паасобных выканаўцаў алімпіяды сведчыць аб поўнай і шырокай магчымасці далейшага колькаснага і якаснага росту мастацкай самадзейнасці прамкааперацыі.

Кампазітар Н. ШЧЭГЛОЎ.

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ „ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА"

Прашу рэдакцыю змясціць гэту заметку з поваду выхаду зборніка маіх вершаў «Нашы дні». У зборнік увайшлі нямногія лірычныя вершы, напісаныя за час з 1922—1936 год.

Звычайна выхад з друку кнігі для аўтара—вялікая радасць. Мне гэты зборнік не толькі не прынёс радасці, але пакінуў прыкрае пачуццё поўнага расчаравання. Гэты зборнік з'яўляецца ўзорам таго, як не трэба друкаваць кніжак. У ім столькі друкарскіх памылак, столькі неахайнасці, што па сутнасці яго не варта было выпускаць у свет. А кніга друкавалася з 1936 года і валялася ў пераплётнай з лістапада 1937 года.

Пасля таго, як зборнік быў надрукаван і трапіў у пераплётную, я прагледзеў яго і выпісаў памылкі. Памылкі былі надрукаваны на асобных лістках, але далёка не ўсе. Лісткі ўстаўлены ў зборнік, у некаторых экземплярах у пачатку кнігі, у другіх—у канцы. У трох зборніках, узятых наўгад, лісткі гэтыя прыклеены ў двух выпадках дагары нагамі, вымазаны клеем так, што іх неададраць ад лісткоў кнігі. Што хацела сказаць выдавецтва сваёю неахайнасцю?

У гэтай заметцы я хачу адзначыць далёка не ўсе памылкі, якія не трапілі ў рубрыку друкарскіх грахоў. На 26 стар., у 3-м радку—«І сімфоніі» замест «У сімфоніі»; на 43 стар. 8-мы радок—«праз» замест «пра»; 58 стар., 2-гі радок знізу—«красуй» замест «красуйся»; 64 стар., 11-ты радок зверху—«Узрок» замест «І зрок»; 69 стар., 3-ці радок знізу—«Сула» надрукавана з малой літары (назва рэчкі); 79 стар., 7-мы радок знізу—«гібельнай» замест «гібелай»; 80 стар., 4-ты радок зверху—«аб» замест «на»; там-жа 5-ты радок знізу—«двабай» замест «дбалай»; 83 стар., 6-ты радок—«лес» замест «лёс»; 84 стар., 4-ты радок—«права» замест «правы»; 90 стар., 12-ты радок знізу—«Вітаем» замест «Вітаеш».

Ці не пара нашаму выдавецтву забяспечыць хоць элементарную граматнасць пры выпуску кніг?

ЯКУБ КОЛАС.

—О—

ГАСТРОЛІ КАЛЕКТЫВАЎ ФІЛАРМОНІІ Ў МАСКВЕ

8 мая два калектывы філармоніі БССР—ансамбль беларускай народнай песні і пляскі ў складзе 40 чалавек і аркестр беларускіх народных інструментаў у складзе 30 чалавек — выехалі ў Маскву, дзе дадуць 8—10 канцэртаў, з іх адзін у Калоннай зале Дома саюзаў і адзін у вялікай зале Кансерваторыі. Астатнія канцэрты адбудуцца ў рабочых клубах.

Адзін канцэрт калектывы філармоніі дадуць у студыі радыёстанцыі імя Комінтэрна для Далёкага Усхода.

Ансамбль песні і пляскі выканае народныя песні—«Ой, зашумела зялёна дубравушка», «Бывайце здаровы», «У Советы ідзём роўнапраўныя, «Камарыкі», «Ой, рэчанька, рэчанька», «Калгасныя частушкі» і пакажа танцы—«Бульбу», «Юрачку», «Лявоніху» і інш.

У рэпертуары аркестра—рандо на беларускія народныя тэмы—музыка Самохіна, «Перапёлачка», «Крыжачок», «Лявоніха» у апрацоўцы Туранкова, «Вясновы дзянёк», «Журавелька», «Ой, хадзіў, гуляў малойчыку», «Вяселле» — музыка Шчэглова, «Купалінька» Грэчанінава. тры экасэзы Шуберта і інш.

„ПАГРАНІЧНІКІ"

(Пастаноўка Бабруйскага калгаснага тэатра).

Малады Бабруйскі калгасна-соўгасны тэатр 18 красавіка паказаў сваю першую работу — спектакль «Пагранічнікі» Біль-Белацэркоўскага. Грамадскасць горада цёпла сустрэла гэту пастаноўку.

Тэатр абраў для свайго дэбюта выключна актуальную п'есу — п'есу аб слаўных абаронцах непрыступных совецкіх граніц. Тэма — блізкая беларускаму народу, які жыве на Заходнім рубяжы Совецкага Саюза. На прыкладзе жыцця совецкай заставы і прымежнай вёскі, з аднаго боку, і шпіёнска-дыверсійнай работы польскай дэфензівы, з другога боку, п'еса ярка адлюстроўвае супроцьлегласць двух светаў — соцыялістычнага і капіталістычнага.

Біль-Белацэркоўскі стварыў драматургічна інтрыгуючую п'есу, багатую цікавымі сітуацыямі і яркімі вобразамі нашых людзей, герайчна змагаючыхся з ворагамі народа. Наша краіна, радзіма соцыялізма, жыве поўнакроўным жыццём. Вораг імкнецца парушыць спакой нашай граніцы, перайсці на совецкую зямлю і шкодзіць усюды і ўсяляк.

Польская разведка забівае нашага пагранічніка, засылае ў СССР шпіёнаў і дыверсантаў. Аднак, граніцы нашы для замежных шакалаў непрыступны, бо іх абараняюць адданыя совецкія людзі.

Правільна зрабіў новаарганізаваны калгасны тэатр, што абраў для пастаноўкі гэту п'есу. І акторы тэатра, палова якіх выйшла з гурткоў мастацкай самадзейнасці горада і вёскі здолелі стварыць паводле гэтай п'есы культурны спектакль.

Маладым акторам, якія выраслі ў совецкіх умовах, перш за ўсё неабходна ўмець ствараць вобразы совецкіх людзей, якія-б хвалявалі і надоўга заставаліся ў памяці гледача. І важнейшая дадатная якасць спектакля тая, што створаныя ў ім вобразы совецкіх людзей добра распрацаваны акторамі і запамінаюцца гледачом. Гэта—начальнік заставы (акт. Я. Н. Кімберг), у якога асабістае жыццё неаддзяліма ад жыцця заставы; Коган (акт. М. Л. Оўштэйн) — часны і адданы грамадзянін сваёй краіны, які геройчна гіне за радзіму, запалонены і закатаваны польскімі варварамі; Магамет (акт. І. Б. Шаферман) — слаўны вартавы совецкіх граніц, які ўсяго сябе аддаў справе абароны радзімы; калгаснік (акт. В. П. Галкін), які пільна сочыць за тым, каб вораг не ступіў на нашу калгасную зямлю, затрымлівае няпрошанага чужынца.



Мастацкая самадзейнасць тарфянікаў. НА ЗДЫМКУ: гурток мастацкай самадзейнасці рабочых і работніц торфарцелі імя XVII партз'езда.

Фота Л. Мазелева (БСФ).

Тав. Кімбергу ўдалося раскрыць тыповыя рысы камандзіра Чырвонай Арміі — дзелавітасць, чуласць да байцоў і выключныя клопаты пра спакой граніцы. Але, на вялікі жаль, гэты вобраз абядняе тое, што актор не здолеў паказаць сапраўды шчырых адносін камандзіра да сям'і, да сваёй жонкі. А гэта значна ўзбагаціла-б вобраз. Кімберг сваю ролю павінен дапрацаваць.

Жыццёрадасны малады пагранічнік Коган быў-бы значна цікавейшым, калі-б актор Оўштэйн другую частку сваёй ролі — у польскай дэфензіве, іграў больш геройчна, без лішняй тэатралізацыі пакут. Але ўсё-ж роля Когана, як і Магамета, у выкананні актора Шафермана зроблена безумоўна добра.

Адным з асноўных персанажаў спектакля з'яўляецца Лена. І, на наш погляд, актрыса А. М. Тарасава правільна раскрыла вобраз хітра замаскіраванай шпіёнкі. Аб гэтай актрысе можна сказаць, што яна ўладае акторскімі данымі і ўмее іх выкарыстоўваць. Актрыса правільна падышла да распрацоўкі вобраза дачкі млынара. Праўда, менш удаўся актрысе фінал ролі.

Польскі капітан (Н. Д. Чэркас) сыгран акторам нядрэнна, але вельмі суха і просталінейна.

Пра адзначаных актораў, якія ствараюць поспех спектакля, трэба сказаць, што гэта моладзь з'яўляецца добрым ядром маладога тэатральнага калектыва.

Было-б няправільным не ўказаць тэатру і на памылкі спектакля. Перш за ўсё, тэатр не здолеў культурна і правільна данесці да гледача слова. Безліч скажэнняў у вымаўленні і няграматныя выразы тлумачацца не толькі тым, што маладыя акторы, значная частка якіх прышла ў тэатр з рускай сцэны, недастаткова авалодалі беларускай мовай, а галоўным чынам тым, што пераклад п'есы на беларускую мову зроблен тав. Дольнікавым неахайна. На неадкладнае выпраўленне перакладу, на выпраўленне дэфектаў вымаўлення трэба зараз-жа звярнуць сур'ёзную ўвагу калектыва. Трэба папракнуць і Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР, якое не зрабіла своечасовай праверкі тэкста перакладу п'есы.

Некаторыя акторы, як Е. Г. Дольнікаў (Сарокін), Е. П. Дземішкан (млынар), А. К. Панкрат (Маруся) павінны яшчэ працаваць і над сваімі ролямі.

На нашу думку, трэба смялей вырашаць увесь спектакль па-рэжысёрску. Больш вынаходлівасці, кантраснасці, выпуклення асобных іграўых сітуацый, на якіх аўтар будуе п'есу.

Поспеху спектакля спрыяе добрае мастацкае афармленне, зробленае Н. А. Кавязіным.

Сям'я беларускіх тэатраў узбагацілася новым тэатрам. І першы поспех яго сведчыць аб тым, што гэта—працаздольны творчы калектыў, які можа даць свайму гледачу — рабочым і калгаснікам цікавыя спектаклі.

А. ЕСАКОЎ.

—О—

ВЫКРЫЦЬ ВУЛЬГАРЫЗАТАРАЎ ДА КАНЦА

Мы, студэнты III курса літаратурнага факультэта Менскага педагагічнага інстытута імя Горкага, лічым своечасовым і карысным выступленне газеты «Літаратура і мастацтва» супроць вульгарызатарства ў выкладанні беларускай літаратуры ў нашым інстытуце.

Лекцыі т. Барысенка сапраўды перапоўнены грубымі выпадамі супроць асобных совецкіх пісьменнікаў, у прыватнасці — супроць З. Бядулі, і скажаюць сапраўдную гісторыю беларускай літаратуры.

Тав. Барысенак не адмовіўся ад ярлыкоў, якімі раппаўская крытыка надзяляла совецкіх пісьменнікаў. Гэты вульгарны сацыялагізм вельмі часта даходзіў у вуснах тав. Барысенка да анекдатычных памераў. Так, напрыклад, рытмічная проза абвяшчалася адрывам ад жывой мовы працоўных мас.

Нажаль, такія метады выкладання не ў аднаго тав. Барысенка. Гэта, відаць, і было прычынай таго, што кафедра літаратуры замест таго, каб выкрыць усе буйнейшыя недахопы ў выкладанні літаратуры ў нашым інстытуце, выдала аб тав. Барысенку спецыяльную пастанову, у якой смехатворна сцвярджаецца поўная непагрэшнасць выкладчыка і амністыруюцца яго мінулыя і ледзьве не будучыя памылкі.

Дарэчы, голасу масы студэнтаў не было чуваць на пасяджэнні кафедры. Затое тав. Барысёнак не скупіўся на пагрозы тым, хто адважыўся яго крытыкаваць.

Большэвіцкая крытыка і самакрытыка яўна не паважаюцца нашай кафедрай літаратуры.

Газета «Літаратура і мастацтва» павінна яшчэ глыбей паставіць пытанне аб выкладанні літаратуры ў нашым інстытуце, у іншых інстытутах і школах БССР.

Ц. БАТВІННІК, С. КУЦАНАЎ, А. ФАРБЕР, Я. ГЛЕЗЕР, І. ГРАМОВІЧ, Ул. КАНДРАЦЕНЯ, П. ЗАБАЎСКІ, З. БАРСУК, П. ПЛОТКІН, С. ЛЕЛЬЧУК.

ПАПРАЎКА

У газеце «ЛІМ» № 25 за 6 мая на другой старонцы пераблытан подпіс пад клішэ. Трэба чытаць: «Першамайскі парад у Менску. На здымку (злева направа): члены Ваеннага Совета БВА камкор Голікаў...» і далей, як надрукавана.

ПІСЬМО М. СЯМАШКУ

Паважаны тав. Сямашка!

З дасланых вамі вершаў мы змаглі скарыстаць два: «Дзявочае» і «Вясна». Астатнія патрабуюць сур'ёзнай дапрацоўкі.

Асноўны недахоп усіх дасланых вамі вершаў заключаецца ў тым, што няма ў іх глыбокага падыходу да тэмы, мастацкія сродкі, закліканыя да раскрыцця абранай вамі тэмы, вельмі аднастайныя.

Абстрактнасць, рытарычнасць, адсутнасць мастацкага доказу ў вывадах і абагульненнях, аднастайнасць эпітэтаў, метафар, параўнанняў — усё гэта робіць вашы вершы падобнымі адзін на другі, хоць і напісаны яны на розныя тэмы.

Амаль у кожным вершы вы, напрыклад, гаворыце аб песні. Песні нашай краіны, магутныя і радасныя, сведчаць аб шчаслівым жыцці совецкага народа.

І людзі ідуць на працу,
Дзівосныя песні пяюць.

Супярэчыць супроць гэтага не прыходзіцца, але дрэнна тое, што ў кожным вершы вы гаворыце аб гэтай песні аднымі і тымі-ж словамі. У вершы «Вясна» вы пішаце:

Каб дзяўчына гэтую песню ўзняла
Да самых глыбокіх і ясных вышынь,
Каб гэтая песня да сонца дайшла...

Прыкладна, гэта самае мы чытаем у вершы «Радзіма»:

На поле ідзе дзяўчына —
Спявае такую песню,
Якая ляціць аж да сонца...

І ў вершы «Песня Сталіну»:

І коціцца песня магутнаю хваляй
Да зор у бяскрайнасць планет.

Не вызначаецца рознастайнасцю вобразны бок верша і ў тым выпадку, калі вы спрабуеце ў жыцці знайсці апраўданне высокаму і шчасліваму гучанню песень нашай краіны.

Радзіма!
Я чую твой голас:
Гудкі гарадоў шматлікіх,
І гоман палёў шырокіх,
І песні вятроў тваіх, —

пішаце вы ў вершы «Радзіма». І амаль тое самае паўтараеце ў вершы «Песня Сталіну».

Спявае заводаў стотысячны голас,
Па моры плывуць караблі,
Бетонам і сталлю [illegible], няспынна
Грымяць дзень і ноч гарады,
І пышна па ўсёй па шырокай краіне
Шумяць, расцвітаюць сады.

Прывядзем прыклады, у якіх вобразнае падабенства поўнае. У вершы «Вясна» чытаем:

Каб песня была, як вясна, маладой,
Гарачай і шчырай такой—без граніц,
Шчаслівая песня краіны маёй,
Краіны найлепшай у свеце вясны.

А ў вершы «Песня Сталіну»:

І песня выходзіць жывой, поўнакроўнай,
Магутнай такой — без граніц,
Насустрач бяскрайнай, як вечнасць, прасторнай
Радзіме вялікай вясны.

Прыведзенае сведчыць аб тым, што над словам і вобразам вы не працуеце. У радкі верша ўкладаюцца ў вас элементарныя думкі, г. зн. тое, што вы калісьці гаварылі, чулі ці чыталі. А штамп, адсутнасць самастойнасці ў вырашэнні абранай вамі тэмы, неарыгінальнасць мастацкіх сродкаў — зніжаюць гучанне верша, робяць яго бледным. І зразумела, што пасля вершаў «Радзіма», «Вясна», «Раздум'і» зусім па-іншаму ўспрымаюцца такія вершы як «Дзявочае», «Дарэмныя трывогі», «Смерць пагранічніка», — па-іншаму, перш за ўсё, таму, што ў іх адчуваецца жыццё, што ў іх паказаны вобразы людзей, што ў іх прысутнічае неад'емная якасць мастацкага твора — канкрэтнасць.

Але шмат недахопаў і ў іх. Вельмі добра, напрыклад, у вершы «Дарэмныя трывогі» паказаны хваляванні хлопца, які сумуе па каханай дзяўчыне, не ведаючы прычын яе адсутнасці на вечарынцы. Самалюбства закаханага перашкаджае яму спытацца аб дзяўчыне ў яе сяброўак. Ён пытаецца аб сваёй каханай у прырэчнай асакі, у лёгкакрылых хмар, у салаўя. У гэтых запытаннях, акрамя настрою героя — яго хвалявання, перададзена адчуванне яго сустрэч з каханай дзяўчынай: верш авеян лірычнай цеплынёй. Але заключная частка верша, якая прэтэндуе на навелістычную канцоўку, некалькі расчароўвае: дзяўчына, аказваецца, паехала на курсы трактарыстаў. Ці трэба было ствараць з гэтага тайну? Ці не магла дзяўчына падзяліцца сваёй радасцю з каханым хлопцам? Відавочна, што сюжэт пабудаван некалькі штучна і ад гэтага губляецца праўдзівасць апісваемага.

Не да месца высокамерныя адносіны маладога паэта да калгаснай дзяўчыны ў вершы «Ты, напэўна, не забыла».

Малады паэт успамінае аб сваёй паездцы ў калгас, успамінае аб дзяўчыне, з якой ён праводзіў час, якая вадзіла яго:

Па палях жытоў высокіх,
Ды вусатых ячмянёў,
Па ўраджайных і шырокіх
Па палях сваіх ільноў.
Завяла на вечарынку,
Не дала адпачываць, —
Наказала — без спачынку
Пад гармонік танцаваць.

У дзеяннях дзяўчыны праяўленне шчырай дружбы. Па-іншаму вядзе сябе паэт. У яго дзеяннях імкненне падкрэсліць сваю перавагу. З дзяўчынай ён гаворыць на «ты», калі яна з ім на «вы»:

... не пушчу вас к цягніку;
...прыязджайце зноў да нас, і г. д.

На развітанні паэт абяцае напісаць аб калгасе цэлую паэму. Арганічнай сувязі героя верша — паэта з калгасам не адчуваецца. Высокамерныя адносіны яго да калгаса, і ў прыватнасці, да дзяўчыны — не тыповы для нашай соцыялістычнай рэчаіснасці.

Да бесканца расцягнут верш «Смерць пагранічніка», з-за чаго губляецца яго напружанасць. Псуюць твор вельмі доўгія разважанні героя аб сваёй падстаячай смерці. Прыкладна, з сярэдзіны верша пачынаецца развітанне з жыццём:

Няхай памру — для вас палі,
Каб вы ўраджаем красавалі,
Каб па ўсёй маёй зямлі
Дзяўчаты весела спявалі.

Далей ідзе:

...апошні ўздых. Вачэй агонь
Згасае ціха ў змроку нізкім.

Радкі хвалююць, але гэта хваляванне зніжаецца тым, што пасля апошняга ўздыху і пасля таго, як згасае агонь вачэй, герой пачынае чарговы маналог.

Расцягнутасць, адсутнасць эканоміі слоў і часу наогул характэрны для вашых вершаў. У гэтым выпадку варта прыпомніць верш Н. А. Некрасава «Форма», у якім паэт піша:

Стих, как монету, чекань, -
Строго, отчетливо, честно,
Правилу следуй упорно:
Чтобы словам было тесно,
Мыслям просторно.

Сустракаюцца ў вашых вершах і проста неахайныя радкі — відаць, рэзультат спешкі. Напрыклад, у пачатку верша «Радзіма» вы пішаце:

Радзіма.
Я гэтае слова
Падслухаў у зор вялікіх,
Ва ўсмешцы шчаслівай мацеры,
У цвеце садоў маладых.

Відавочна, што падслухаць што-небудзь ва ўсмешцы і ў цвеце (хоць-бы і садоў) нельга, ва ўсмешцы і ў цвеце можна толькі ўбачыць. Можна прывесці і другія прыклады, але немагчыма ў кароткім пісьме даць поўны разгляд усіх вашых вершаў. Ясна адно, што трэба выхоўваць у сабе пачуццё мастака, а гэта значыць, што ў паказваемых вамі тэмах трэба знаходзіць галоўнае, знаходзіць тыповае ў тыповых абставінах. Трэба імкнуцца да эканоміі мастацкіх сродкаў. Трэба зразумець, што патрэбныя вобразы — эпітэты, метафары — непазбежна вырастаюць з самой тэмы, ваша задача — угадаць іх пачуццём мастака. Толькі ў гэтым выпадку верш можа быць непасрэдным і арыгінальным. Ва ўсіх іншых выпадках вобразы — эпітэты, метафары — аказваюцца навеянымі з боку, узятымі з прачытанага, чутага і таму, як правіла, не могуць мець глыбокай арганічнай сувязі з абранай вамі тэмай і ідэяй.

Пішыце, шліце новыя вершы. Супярэчце супроць таго, з чым не згодны. У дадзеным выпадку мэта ў нас з вамі адна — бачыць у друку вашы добрыя вершы.

Ал. ШАРАПАЎ.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела Г—4650